Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
28 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 167 (29281)



БУДЗЕМ З ЦЯПЛОМ... ТАННЫМ
МС

АДПАЧЫЦЬ У КНЯЗЕВЕ. ЯК КНЯЗІ?
МС



9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр МАРКЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Для кожнага грамадзяніна, дзяржаўнага органа, грамадскай арганізацыі важна захаваць бяспеку, стабільнасць у краіне. Шлях да гэтага — дыялог. І не трэба чакаць перамен, трэба мяняць сваё жыццё на аснове Канстытуцыі, здаровага сэнсу. Мяняць па-людску — ствараючы, а не руйнуючы».*

Усяму галава

# Адчуць водар дзяцінства...



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СТАР. 3

## КОРАТКА

- **У Беларусі распрацоўваюць стратэгію развіцця з нізкім узроўнем парніковых газаў да 2050 года.**
- БелАЗ выйграў тэндар на пастаўку 96 самазвалаў у Індыю.



- **У Расіі стварылі прыбор, які выяўляе COVID-19 у паветры.**
- «Гомельаблмаёмасць» прапануе больш за 80 аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, за адну базавую велічыню кожны.
- **Больш за 24 мільёны чалавек у свеце заразіліся каранавірусам.**
- У Пінскім раёне сабака загрыз вожыка і захварэў на шаленства.
- **Дзіця патанула ў дэкаратыўным вадаёме ў Брэсцкім раёне.**

ISSN 1990 - 763X
20167
9 771990 763008

Напярэдадні

# ПА ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ

**У першую нядзелю восені краіна святкуе Дзень беларускага пісьменства. Сёлета яго ўдзельнікаў будуць прымаць у Бялынічах Магілёўскай вобласці. Менавіта тут 6 верасня сустрэнуцца ўсе тыя, хто працуе дзеля захавання друкаванага слова, папулярызацыі традыцый нацыянальнай культуры і памнажэння духоўнасці беларускага народа.**

СТАР. 5







# ЧАМУ ГАРАЦЬ КАМБАЙНЫ?

**Сельскагаспадарчая тэхніка гарыць нячаста, але кожны такі выпадак звязаны з вялікім уронам для гаспадаркі. Са строю вокамгненна выходзіць агрэгат коштам дзясяткі тысяч долараў. Акрамя таго, пад рызыкай аказваецца своечасовая ўборка ўраджаю. Чаму гараць камбайны, «Звяздзе» расказаў начальнік упраўлення спецыяльных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Беларусі па Мінскай вобласці падпалкоўнік юстыцыі Дзмітрый МУРАШКА.**

## Хутка, якасна, танна. Трэці — лішні

— Прычыны такіх пажараў можна падзяліць на некалькі груп. Асноўная — гэта чалавечы фактар. Значна радзей сустракаюцца дзве іншыя — аварыйныя сітуацыі, развіццё якіх прадказаць даволі складана, і розныя форс-мажорныя абставіны.

Чалавечы фактар звычайна вынікае з няправільнага абслугоўвання тэхнікі. У ідэале яно павінна адбывацца згодна з рэгламентам, вызначаным заводам-вытворцам. Але ідэал, як вядома, недасяжны. Апроч таго, не ўсе гаспадаркі прытрымліваюцца пэўных правілаў — своечасова зрабіць замену запчасткі (лепш на арыгінальную), правесці належным чынам тэхнічнае абслугоўванне або скарыстацца паслугамі афіцыйнага сэрвіснага цэнтра.

А тэхніку на поле выпускаць трэба, таму што ўборачную ніхто не адмяняў. Каб зрабіць рамонт хутчэй і танней, ставяць вузел, які ўжо быў у карыстанні. Але пры гэтым давайце згадаем трыяду «хутка, якасна, танна», у якой, як вядома, адначасова тры складнікі існаваць не могуць — заўсёды знойдзецца «трэці лішні». Вось такім «лішнім» фактарам і становіцца якасць. Але да пары да часу. Напрыклад, калі гаворка ідзе пра паліваправод ці пра рукаў высокага ціску, то там знаходзяцца разагрэтыя гаручыя вадкасці.

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «СТАБІЛЬНАЯ РАБОТА БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ — КРАЕВУГОЛЬНЫ КАМЕНЬ ЭКАНОМІКІ КРАІНЫ»

**Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на нарадзе па развіцці найважнейшых арганізацый Міністэрства прамысловасці**

**Галоўнай тэмай нарады стала сітуацыя, якая склалася на найбуйнейшых прадпрыемствах Мінпрама, перадае БелТА. «Мы ўдакладнім, чым яны жывуць і, самае галоўнае, якой мы бачым перспектыву на гэтых прадпрыемствах», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён нагадаў, што некалькі дзён таму прыняў з дакладам першага віцэ-прэм'ера і міністра фінансаў. На сустрэчы з імі быў прааналізаваны стан спраў у крэдытна-фінансавай сістэме, разгледжаны пытанні напаўняльнасці бюджэту. «Усе вельмі добра разумеюць: ***чым больш эфектыўная работа прамысловых прадпрыемстваў, тым больш сродкаў паступіць у бюджэт. А значыць, дзяржава зможа прафінансаваць сацыяльныя праграмы ў большым аб'ёме.*** Мы, прааналізаваўшы бюджэт, не бачым праблем з фінансаваннем асноўных сацыяльных мерапрыемстваў на гэты год, у тым ліку і па заработнай плаце. У сувязі з гэтым стабільная работа прамысловасці, асабліва нашых найбуйнейшых прадпрыемстваў, — краевугольны камень эканомікі краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## «Трэба разлічваць на свае сілы»

Прэзідэнт дадаў, што бягучы год прынёс нямала выпрабаванняў: з-за пандэміі каранавіруса закрыліся многія рынкі, практычна спыніўся паўнавартасны рух капіталу і тавараў, асабліва па тых пазіцыях, якія вырабляюцца ў Беларусі. Цяпер да гэтага дадалася і няпростая палітычная абстаноўка ў дзяржаве, якую, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, спрабуюць расхістваць як знутры, так і звонку. «Уплыў гэтага націску на ўнутрыэканамічную сітуацыю адчуваецца, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Яшчэ раз хачу падкрэсліць: ніякай бязвыплатнай дапамогі нам ніхто не акажа. Нам трэба разлічваць на свае сілы і магчымасці».

Ва ўдзельнікаў нарады, перш за ўсё кіраўнікоў прадпрыемстваў, Прэзідэнт пацікавіўся, якая маральна-псіхалагічная абстаноўка ў працоўных калектывах, як ідуць вытворчыя працэсы і як складваецца сітуацыя з экспартам прадукцыі. ***«Збыт прадукцыі — гэта наша ключавая задача.*** Адсюль і валюта, і курс рубля і гэтак далей. Нельга сядзець і чакаць, што нехта да нас прыйдзе, выстраіцца ў чаргу перад варотамі завода і купіць гэтую прадукцыю. Трэба варушыцца самім. Патрэбны меры падтрымкі экспарту — мы іх аказваем. Можа, яшчэ чым-небудзь трэба дапамагчы?» — спытаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаўся аб правакацыйных дзеяннях у адносінах да Беларускага аўтамабільнага завода. «Што там на БелАЗе? Яны (правакатары. — **«Зв.»**) ужо так паскудна сябе паводзяць. Гэта ўчора мы бачылі: белазаўцы ідуць стомленыя са змены дамоў,



Фота БелТА.

за прахадную выйшлі, а яны сцяг расцягваюць і ідуць па баках і робяць карцінку... Я ж ведаю, як гэта робіцца. Ніякім белазаўцам гэта не трэба. Яны ж добра разумеюць: ***спыніцца сёння БелАЗ — і горада не будзе»***, — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, па выніках сямі месяцаў амаль усе галіны прамысловасці дабавілі ў тэмпах росту, зніжаюцца запасы гатовай прадукцыі. Вядома, гэта станоўчыя сігналы, сказаў ён. У той жа час Прэзідэнт пацікавіўся прагнозамі, як прадпрыемствы плануюць завяршыць 2020 год. «Наступны год — гэта пачатак новай пяцігодкі. Чаго б нам ні каштавала, трэба напружыцца і на фінішы дабавіць», — падагульніў беларускі лідар.

## «У наяўнасці дыпламатычная вайна»

«Мы сёння маем у наяўнасці пэўны этап гібрыднай, скажам адкрыта, вайны супраць Беларусі. А як гэта інакш назваць? Сродкі масавай інфармацыі і інфармацыйная сфера прасякнута гэтай барацьбой, вайной процiборствуючых бакоў. Дыпламатычная бойня супраць нас пачалася, і на самым высокім узроўні», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што «нясталыя суседзі» Беларусі не толькі адкрыта заяўляюць пра сваю пазіцыю наконт паўторных выбараў у краіне, але і пачынаюць умешвацца ва ўнутраныя справы краіны, націскаць на дзяржаву. «У наяўнасці дыпламатычная вайна», — яшчэ раз падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што ***краіна цяпер вымушана траціць вялікія грошы, каб стабілізаваць абстаноўку на заходніх граніцах, куды перакінуты некаторыя вайсковыя часці.*** «Вы бачыце гэтыя заявы аб тым, што калі Беларусь распадзецца, то Гродзенская вобласць адыдзе да Польшчы. Яны пра гэта ўжо адкрыта кажуць, спяць і сняць. Нічога ў іх у гэтым плане не атрымаецца, гэта я ведаю дакладна», — заявіў беларускі лідар.

## «Не дапусцім абвалу нацыянальнай валюты»

«Цяпер ужо адкрыта нашы ўнутраныя нягоднікі заклікаюць дэстабілізаваць фінансавы рынак. Некаторыя людзі ж гэтаму паддаюцца — валюту з банкаў забраць і гэтак далей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не дапусцім абвалу нацыянальнай валюты. Калі народ хоча купіць долар — калі ласка, ён сёння каштуе колькі каштуе. У нас плаваючы курс: попыт вялікі — значыць, даражэйшы будзе гэты долар або еўра, попыт меншы — значыць, будзе танней каштаваць. Мы, учапіўшыся рукамі, не стрымліваем курс рубля», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што ў Беларусі яшчэ не пачалі па-сапраўднаму выкарыстоўваць золатавалютныя рэзервы. «Малайцы ў Нацыянальным банку, урадзе. Як адчуваў: тры месяцы таму паставіў задачу ўсе золатавалютныя рэзервы вярнуць у краіну, асабліва залаты запас. У нас да грама золата вернута ў краіну», — падкрэсліў ён.

«Таму няма такой катастрофы. Так, у якіх-небудзь абменніках калі-нікалі можа не хапаць наяўных грошай. Але гэта заўсёды бывае, калі павышаны попыт. Я даручыў Нацыянальнаму банку, каб мы маглі пазбегнуць такой сітуацыі. Людзі хочуць забраць свае грошы або валюту — калі ласка, бярыце. ***У нас абсалютна дастаткова рэзерваў, каб на прымальным узроўні стрымаць прымальны для нас курс»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама расказаў, што Беларусь правядзе з Расіяй перагаворы аб рэфінансаванні $1 млрд доўгу. «Мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі, і сёння наш прэм'ер-міністр праводзіць перагаворы з Міхаілам Мішусціным (прэм'ер-міністрам Расіі. — **«Зв.»**) наконт рэфінансавання», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён удакладніў, што размова ідзе аб рэфінансаванні ў бягучым годзе $1 млрд з доўгу перад Расійскай Федэрацыяй. «Гэта значыць, мы ў сябе гэты мільярд долараў, дамовіўшыся з Расіяй, пакінем. І гэта будзе добрае падмацаванне нашай нацыянальнай валюты», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Больш за тое, значныя валютныя паступленні чакаюцца ад экспарту. «Цяпер экспарт наш пайшоў ня́драэнна, асабліва ў РФ, КНР. А экспарт — гэта паступленне валюты», — сказаў Прэзідэнт.

## «Большасць дэпутатаў не са слабага дзясятка»

Прэзідэнт выказаўся наконт заклікаў апазіцыі да грамадзян адклікаць дэпутатаў у сваіх акругах: «Узяліся за дэпутатаў. Слухайце, а яны ж у чым вінаватыя? Выбары прайшлі, выбралі дэпутатаў, усе пагадзіліся. Не, пачалі бадзягу: адклікаем дэпутатаў... Няхай паспрабуюць. Мы ж цудоўна разумеем: паваліць Прэзідэнта не ўдалося — трэба расхістаць парламент».

«Думаю, што пераважная большасць нашых дэпутатаў не са слабага дзясятка, і дэпутаты павінны ведаць, што ў іх ёсць Прэзідэнт, які заўсёды зможа іх абараніць. Без усякіх праблем», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён канстатаваў, што на дэпутатаў пачаліся накаты — патрабуюць ад іх грошай, падтрымкі, выходзіць на вуліцу. «Не выйшлі, значыць, мы вас адклічам... Ну паспрабуйце», — адзначыў Прэзідэнт.

## «З вуліцай справімся»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ў Беларусі пераадолеюць сітуацыю, звязаную з несанкцыянаванымі вулічнымі акцыямі. «Галоўнае для нас — эканоміка. ***Калі ў нас будуць нармальна працаваць прадпрыемствы, нам не страшныя ніякія катаклізмы.*** З вуліцай мы справімся, як бы ім ні хацелася дэстабілізаваць гэту абстаноўку», — заявіў беларускі лідар.

Ён адзначыў: ужо ўсе людзі адчулі, што дзеючаму Прэзідэнту ёсць на каго абаперціся. «Ужо ў мітынгах у падтрымку міру, спакою, дзеючага Прэзідэнта выступіла амаль тры мільёны чалавек. Гэта ж сіла — тры мільёны чалавек, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Наш электарат больш спакойны: ветэраны, пенсіянеры, спецыялісты. Яны ведаюць сваю справу, працуюць. Таму мы і будзем мець тую колькасць людзей — 80 працэнтаў, якія за нас прагаласавалі».

«Таму трэба жыць спакойна, займацца кожнаму сваёй справай. А што датычыцца мяне, сілавых структур і іншых, мы будзем займацца таксама сваёй справай. Выключна згодна з законам. Таму трэба адкрываць Біблію, я маю на ўвазе закон, і чытаць: гэта — санкцыі такія, вось гэта — санкцыі такія. Мы не крыважэрныя, мы не збіраемся нікога душыць, ганяць па вуліцах, калі нас да гэтага не вымушаюць», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што ўлады абавязаны абараніць людзей. «Людзі стаміліся, людзі зразумелі, што такое жыць у спакойным горадзе-героі Мінску, а што такое, калі бамбяць вуліцы, калі на балконы закідваюць кактэйлі Молатава і іншыя, пакуль петарды. Не дай бог пачнуць кідаць гранаты. Ужо вакол нашай краіны сфарміраваліся групоўкі, якія гатовы сюды прыйсці і распаліць гэты пажар. Мы гэтага дапусціць не можам. Я гэта гавару прама і не збіраюся нікога запалохваць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «Калі нехта хоча дыялогу, калі ласка»

Прэзідэнт заявіў, што гатовы весці дыялог, у тым ліку наконт абнаўлення Канстытуцыі. І весці гэты дыялог ён у першую чаргу мае намер з працоўнымі і студэнцкімі калектывамі. «Калі нехта хоча дыялогу, калі ласка. Якраз студэнцкія калектывы — гэта тыя калектывы, з якімі я гатовы весці дыялог. Працоўныя калектывы (я пра гэта казаў ужо). Калі ласка, фарміруйце сваіх прадстаўнікоў і будзем весці дыялог, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Усе хочуць новага палітычнага ўпарадкавання. Ды калі ласка, ***давайце возьмемся за Канстытуцыю***, уносьце прапановы, сфарміруем новую Канстытуцыю — гэта галоўны закон у любой краіне. І адштурхоўвацца трэба ад Канстытуцыі».

«Таму давайце садзіцца — прадстаўнікі ўсіх працоўных калектываў, студэнцкіх калектываў (гэта будучая эліта нашай краіны, з імі і трэба весці гэты дыялог). І з працоўнымі калектывамі, якія сёння працуюць, нягледзячы ні на што. І вяскоўцы маюць права на сваё слова, і рабочыя хочуць сваё слова сказаць, і спецыялісты гэтых прадпрыемстваў, і настаўнікі, і ўрачы. А не малойчыкі, якія бясчынствуюць, ходзяць па вуліцах і крычаць, што яны хочуць дыялогу. Ніякага дыялогу яны не хочуць. І з вуліцай ніхто з улад за стол перагавораў не сядзе», — сказаў Прэзідэнт.

«Вось маё выразнае ўяўленне і заява наконт дыялогу, з кім гэты дыялог мы можам весці. Калі ёсць разважлівыя людзі ад апазіцыі, якія бачаць сваю краіну свабоднай і незалежнай, калі ласка, выказвайце сваю пазіцыю, але не на вуліцы. ***Пад націскам вуліц ніякага дыялогу ў Беларусі не будзе»***, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка на нарадзе таксама выказаўся наконт палітычных заклікаў да студэнтаў з боку тых, хто спрабуе расхістаць абстаноўку ў краіне. «Яны і ў палітычным плане пачынаюць сёння падбухторваць студэнтаў: першага верасня прыедзце на занятк — выходзьце на вуліцы і гэтак далей. Мы цяпер да студэнтаў давядзём тую інфармацыю, якую павінны давесці, да кіраўніцтва ВНУ. Яны, у рэшце рэшт, адказваюць за сітуацыю ў сваіх ВНУ, і яны адкажуць, як і кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«А потым: вы ж павінны разумець, што хлопцам мы далі адтэрміноўку ад арміі на час вучобы ў ВНУ. Ну, не хочуць вучыцца, тады Радзіму трэба абараняць. У нас Айчына ў небяспецы», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Я ўяўляю, што пасля гэтага пачнецца. Мяне стануць папракаць, што я запалохваю студэнтаў у армію адправіць. Ды не! Паўтараю: хто хоча вучыцца, той будзе вучыцца, будзе мець гэту адтэрміноўку. Хто пойдзе на вуліцу або вучыцца не захоча, меры прымем згодна з законам», — сказаў ён.

# ПА ЗАКЛІКУ СЭРЦА



## На Гродзеншчыне працягваецца эстафета мітынгаў «За Беларусь»

**Днямі да акцыі далучыліся адразу пяць райцэнтраў. Людзі прыйшлі на гарадскія плошчы пасля рабочага дня. Тут сабраліся прадстаўнікі многіх калектываў і проста неабыякавыя мясцовыя жыхары, каб выказаць сваю пазіцыю — за мірнае жыццё, бяспечную і суверэнную дзяржаву.**

У Дзятлаве людзі сабраліся на плошчы 17 верасня. Многія трымаюць у руках плакаты, на якіх надпісы «Беларусь у маім сэрцы», «Мы хочам жыць мірна». Некаторыя прыйшлі з шарамі, на якіх адбіта народная сімволіка, на іншых словы — «Я люблю Беларусь!»

— Я прыйшла сюды па закліку сэрца. Кожны дзень гляджу тэлевізар і плачу за нашу Радзіму, — падзялілася сваімі перажываннямі дзятлаўчанка Тамара Буяк. — Не дай Бог, каб Беларусь падзялілі. Мы з землякамі тут, каб гэтага не дапусціць. Як педагог не жадаю, каб беларускія настаўнікі падзяліліся на два лагеры. У нас адзіная задача — вучыць дзяцей, рабіць гэта разам, у згодзе.

У Карэлічах акцыя прайшла ў фармацэ канцэрта на мясцовым стадыёне «Юнацтва». На полі ўладкавана імправізаваная сцэна. На ёй — вялікі плакат з буслом, што ляціць над жытнёвым полем. Прысутныя цёпла віталі ўсіх, хто падыходзіў да мікрафона, каб выказаць сваю пазіцыю. Падзяліўся сваімі думкамі і старшыня райвыканкама Генадзь Шатуеў. Ён нагадаў, што жыхары Карэліч ужо выказалі сваю падтрымку сучаснаму курсу на акцыях у Мінску і Гродне. А цяпер яшчэ раз робяць гэта ў сваім пасёлку. Ён упэўнены, што ўсе пытанні павінны вырашацца за сталом перагавораў, а не на вулічных акцыях і пратэстах.

За мір і адзінства выступілі ашмянцы. Прадстаўнікі ўлады звярталіся да прысутных не паддавацца на правакацыі, да якіх заклікаюць апаненты. Бо галоўная мэта — гэта праца, умацаванне эканомікі сваіх прадпрыемстваў: так, як гэта зараз робяць сельскія працаўнікі. Яны штодзень працуюць на палях, збіраюць ураджай, клапоцяцца пра тое, каб людзі мелі на стале прадукты харчавання. Сярод тых, хто выказаў сваё меркаванне, былі ганаровы грамадзянін Ашмян, ветэран працы — былы малалетні вязень фашысцкага канцлагера, настаўніца, шматдзетная маці, гісторык, алімпійскі чэмпіён.

На плошчы Ратушнай сабраліся жыхары Берастравіцкага раёна. Яны прыйшлі, каб выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю ў падтрымку міра, бяспекі і дабрабыту краіны. У руках удзельнікі акцыі трымалі плакаты «Наша сіла ў адзінстве», « За мір у нашых сем'ях», «Беларусь — наш агульны дом». Падчас выступленняў прамоўцаў людзі скандзіравалі: «Беларусь не аддадзім!»

Выйшлі на гарадскую плошчу з патрыятычнымі лозунгамі і жыхары Навагрудка. Мітынг прайшоў з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, работнікаў прадпрыемстваў і простых гараджан, якія занепакоены будучым лёсам краіны. Многія аднадушныя ў тым, што Беларусь — гэта суверэнная дзяржава, у якой рэалізаваны цэлы шэраг праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця, наладжана сучасная вытворчасць, забяспечаны сацыяльныя гарантыі для сем'яў, дзяцей, сталых грамадзян. Ашмянцы хочуць мірнага заўтра — ад бурных падзей апошніх тыдняў, здаецца, сталіміся ўсе.

— У гэты няпросты час кожны беларус павінен зрабіць усё магчымае, каб зберагчы мір і парадак у сваёй краіне. Наша Беларусь — прыгожая і незалежная дзяржава, кожнаму жыхару даступныя якасная адукацыя і медыцынская дапамога. У тых, хто добрасумленна працуе, — годны, стабільны заробак. Нам трэба памятаць, што мы адзіны народ, — нагадала жыхарка Ашмян Ліна Кармызава.

Пра тое ж гаварыла і ветэран працы Марыя Гайдус, якая 35 гадоў працавала швачкай. Яна таксама лічыць, што нечага дасягнуць у жыцці можна толькі працай. Гэтаму трэба вучыць і новае пакаленне. А яшчэ — цаніць тое, што ёсць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Адчуць водар дзяцінства...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Праходзьце, калі ласка, толькі без спецыяльнай экіпіроўкі ў цэх не пусцім, — ветліва кажа **Марыя КІШКУРНА, начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі хлебазавода № 6 КУП «Мінскхлебпрам».** Менавіта яна праводзіць экскурсію. — Самае першае, з чаго пачынаецца доўгі і цікавы працэс вырабу прадукцыі — гэта паступленне на хлебазавод якаснай сыравіны: мукі, цукру, дражджэй, соладу, кмену, солі. За гэтую якасць адказвае вытворча-тэхналагічная лабараторыя.

Перад пачаткам падрыхтоўкі паўфабрыкатаў і цеста ўся сыравіна праходзіць стадыю прасейвання сухіх кампанентаў, падрыхтоўкі цукровага і салявога раствору. Далей — заквасачнае і мясільнае аддзяленні. Пасля таго як гатовае цеста выбрадзіць (гэта яшчэ прыкладна гадзіна), яно паступае на фармоўку. А там — да іншых стадый прыгатавання.

— Уся вытворчасць аўтаматызаваная. Хлеб робіцца на заквасцы па чатырохэтапным цыкле. Кожнае цеста замешваецца ў залежнасці ад рэцэптуры. Напрыклад, на падрыхтоўку жытне-пшанічнага хлеба ідзе ад дзесяці да васямнаццаці гадзін. Пшанічнага — у залежнасці ад спосабу прыгатавання цеста — да пяці гадзін. На хлебазаводзе выпускаюцца розныя віды белага і чорнага хлеба (з жытняй, пшанічнай мукі і сумесі жытняй і пшанічнай), таксама вялікі асартымент кандытарскіх вырабаў. Штогод попыт на нашу прадукцыю павялічваецца. Мы заўсёды праводзім маркетынгавыя даследаванні, перад тым як распрацоўваць новы выраб. Такі працэс не вельмі хуткі: трэба вывучыць пакупніцкі попыт, стварыць новую рэцэптуру, вырабіць пробныя выпечкі, правесці дэгустацыі і ўкараніць вынік у вытворчасць, — удакладняе Марыя Кішкурна.

Апошнія навінкі хлебазавода — хлеб «Трыумф» і «Елісейскі». Таксама многім даспадобы «Бабулін» без дабаўлення Е-кансервантаў і «Раднікова новы». Спецыяліст расказала, што цяпер карыстаецца попытам і саладкаваты хлеб з рознымі дапаўненнямі: кунжутам, семкамі і іншым.

— Мы на гэта арыентуемся. Робім акцэнт на натуральную прадукцыю, дзе менш харчовых дабавак або яны адсутнічаюць. Людзі цяпер больш сочаць за правільным харчаваннем, і хлебапёк павінны гэта ўлічваць. Аднак не забываем, што галоўнае — традыцыі, таму звычайны жытні або жытне-пшанічны хлеб карыстаецца папулярнасцю заўсёды.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Пекар-майстар Веранiка ВАШКЕВІЧ і начальнік вытворчай тэхнічнай лабараторыі Марыя КІШКУРНА.**

Пасля ўсіх этапаў сыравіна праходзіць пільны лабараторны кантроль. Кожную партыю хлеба чакае праверка на адпаведнасць розных паказчыкаў: гэта і пах, і смак, і колер, і стан мякішу. Толькі потым прадукцыя пакуецца і адпраўляецца па крамах.

Кожныя суткі хлебазавод № 6 КУП «Мінскхлебпрама» вырабляе да 60 тон прадукцыі, у тым ліку каля 40 тон хлеба і 4,4 тоны кандытарскіх вырабаў. За гэты год плануецца выпусціць больш за 20 тысяч тон. Колькасць работнікаў, якія заняты на хлебазаводзе, — прыкладна 400 чалавек, з якіх 75 працэнтаў — жанчыны. Усяго КУП «Мінскхлебпрам» рэалізоўвае каля 100 тысяч тон хлебапрадукцыі ў год. Яна адпраўляецца не толькі ў Расію, але і ў Азербайджан, Арменію, Латвію, а таксама ў Ізраіль, Іарданію і В'етнам.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

На кантролі

# ПАСТУПОВАЕ РАЗВІЦЦЁ

**Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у пасяджэнні назіральнага Савета ААТ «Нафтан»**

**Старшыня Савета Рэспублікі з'яўляецца кіраўніком назіральнага Савета прадпрыемства.**

На парадку дня знаходзіліся некалькі пытанняў, галоўныя з якіх — вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства за першае паўгоддзе 2020 года, выкананне ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы і рэалізацыя бізнес-плана развіцця.



Фота: стоп-кадр «Вектар-ТВ».

Як паведаміў членам назіральнага Савета генеральны дырэктар ААТ «Нафтан» Аляксандр Дзямідаў, эканоміка прадпрыемства знаходзілася пад уздзеяннем негатыўнага знешняга асяродку, у той жа час на заводзе працягвалася актыўная рэалізацыя праграмы па пастаўках альтэрнатыўнай нафты. Нагадаем, ААТ «Нафтан» прасоўвае праграму дыверсіфікацыі паставак нафты: сюды на перапрацоўку ўжо былі пастаўлены гатункі амерыканскай, нарвежскай і арабскай нафты. Таксама была працягнута праграма па скарачэнні выдаткаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Актуальна

# ПУЦІН ЛІЧЫЦЬ, ШТО НА ПРАЦЭСЫ Ў БЕЛАРУСІ ХОЧУЦЬ УПЛЫВАЦЬ ЗВОНКУ

**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін лічыць, што на працэсы ў Беларусі хочуць уплываць звонку дзеля пэўных палітычных інтарэсаў. З такой заявай ён выступіў у інтэрв'ю тэлеканалу «Расія-24», паведаміла ТАСС.**

«Справа не ў тым, што цяпер адбываецца ў Беларусі, а ў тым, што некаму хочацца, каб там адбывалася нешта іншае. Хочуць уплываць на гэтыя працэсы і дабіцца нейкіх працэсаў, як лічаць гэтыя людзі, адпаведных іх палітычным інтарэсам», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Расійскі лідар ацэньвае дзеянні праваахоўных органаў Беларусі як даволі стрыманыя. «Калі ўжо быць аб'ектыўным, то я думаю, што праваахоўныя органы Беларусі паводзяць сябе даволі стрымана, нягледзячы ні на што», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Меркаванне

# «Мы прааналізуем, чаму так адбылося»

## Дэпутат Палаты прадстаўнікоў пра беларускую моладзь

**«Звязда» папрасіла члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Таццяну АЎТУХОВУ адказаць, што, на яе думку, увабрала ў сябе паняцце «дзяржаўная ідэалогія» ў сферы адукацыі:**



«Дзяржаўная ідэалогія — гэта перад усім прывіццё маладому пакаленню любові да Радзімы, нацыянальных сімвалаў, павагі да гістарычнай і культурнай спадчыны, разнастайнасці свету, любові да малой радзімы, павагі да старэйшых, асаблівай увагі да ветэранаў, — лічыць парламентарый. — Выкладчыкі ў сваёй штодзённай дзейнасці сцвярджаюць гэтыя каштоўнасці.

З сітуацыі, якая адбываецца сёння, мы вынесем урокі, прааналізуем, чаму так адбылося, што наша моладзь схільная да такога знешняга ўплыву. Няправільна сказаць, што неабходна выбудоўваць ідэалагічную работу ва ўстановах адукацыі, бо яна існуе: на ўроках рэалізуецца трыадзіная мэта — адукацыйная, развіваючая і выхаваўчая. І апошняй удзяляецца асаблівая ўвага на кожным уроку, пазакласным мерапрыемстве, ва ўстановах дадатковай адукацыі. Чаму дзеці апошнім часам аказаліся ўцягнутыя ў палітыку? Тут яшчэ неабходна разабрацца. Сказаць, што была паслаблена выхаваўчая работа ў галіне адукацыі? Я так не лічу, асабліва гэтым займаліся напярэдадні 75-годдзя Вялікай Перамогі.

Сёння задача ўсёй педагагічнай грамадскасці — арганізавана пачаць вучэбны год. Настаўніку трэба разумець, што ён будзе вучыць тых, хто «за» і хто «супраць», і менавіта яму неабходна тых, хто памыляецца, пераканаць».

Надвор'е

# Чакаем спякоту з Балкан

## У нядзелю і панядзелак кароткія дажджы і да плюс 32 градусаў

**Усе прасілі дажджу. Вось ён і прыйшоў — атлантычны цыклон, цэнтр якога ўчора знаходзіўся на поўначы Беларусі. Гэты атмасферны віхор з разраду не вельмі актыўных, тым не менш дажджы рознай інтэнсіўнасці прайшлі паўсюдна. А ў выніку паменшыўся дэфіцыт жнівеньскіх ападкаў, паведамляюць эксперты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У наступныя суткі цыклон працягне перамяшчацца на ўсход. Будзе воблачна з праясненнямі, удзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Прагназуецца цёплае надвор'е — плюс 17—22 градусы. Тэмпературы не вельмі высокія, але такі тэмпературны фон будзе блізкі да сярэдніх шматгадовых значэнняў для гэтых дат жніўня.

У суботу пашырыцца воблась павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў адносна халоднай паветранай масе. Раніцай і ўдзень у заходніх і цэнтральных раёнах адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы. Уначы чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Удзень будзе воблачна з праясненнямі, у заходніх і цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай — слабы туман. Вецер прагназуецца ўначы няўстойлівы слабы, удзень паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 13 градусаў, месцамі пахаладае да плюс 5. Удзень будзе 16—23 цяпла, а па поўдні краіны — ад 24 да 28.

Па-сапраўднаму прыпячэ ў нядзелю. У гэты дзень чакаецца, што накіраванасць паветраных патокаў зменіцца з паўночна-заходняй на паўднёвую і на Беларусь распаўсюдзіцца цёплае паветра з Балканскага паўвострава. У паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Уначы і раніцай у нізкіх месцах і паблізу вадаёмаў могуць згушчацца слабыя туманы. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Значна цяплей стане ўначы. У гэты час тэмпература паветра складзе 11—17 цяпла. Днём чакаецца 20—26 градусаў, а па паўднёвым усходзе стане нават вельмі горача — ад 27 да 32.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак захаваецца ўплыў вельмі цёплых паветраных мас паўднёвага паходжання. Уначы пераважна па паўночным захадзе, раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткія летнія дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 цяпла. Удзень будзе зусім па-летняму — ад 20 да 26 градусаў, па паўднёвым усходзе — плюс 27—32. У аўторак, у першы дзень восені, рост атмасфернага ціску будзе спрыяць спыненню дажджоў. Уначы пасвяжэе, а ўдзень будзе ад 16 да 27 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» информирует о проведении повторных электронных торгов 2020.Г.002.00019 по продаже имущества**

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие радиотелецентр «Телерадиокомпания «Витебск».

**Организатор, оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга».

**Электронный адрес ЭТП:** https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов**: 28.09.2020 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Транспортное средство SKODA SUPERB, 2009 г. в., тип – легковой седан, рег. знак 1122 ВМ-2, кузов № TMBAB43T399024149, цвет – серый металлик, инв. № 500984. Нач. цена: 18 960,00 бел. руб. с НДС.

**Лот № 2**. Транспортное средство VOLKSWAGEN TOURAN, 2007 г. в., тип – легковой специальный минивэн, рег. знак 1515 АХ-2, кузов № WVGZZZ1TZ7W072514, цвет – серебристый металлик, инв. № 500982. Нач. цена: 15 120,00 бел. руб. с НДС.

**Лот № 3**. Транспортное средство «ДАЧИА ЛОГАН», 2008 г. в., тип – легковой специальный универсал, рег. знак 9551 ВВ-2, кузов № UU1KSDAD539222744, цвет – серебристый металлик, инв. № 500983. Нач. цена: 11 760,00 бел. руб. с НДС.

Местонахождение имущества: г. Витебск, ул. Коммунистическая, 8. Извещение об электронных торгах опубликовано 26.08.2020 г. на сайте Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, на сайте Витебского облисполкома **http://vitebsk-region.gov.by**, на сайте электронной торговой площадки **https://etpvit.by**. Контактные тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56.


# ЧАМУ ГАРАЦЬ КАМБАЙНЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры пашкоджанні камунікацый масла ці паліва трапляе на вузлы, дзе заўсёды трымаецца высокая тэмпература, — напрыклад, на выхлапную сістэму. А генератар і стартар увогуле могуць штатна іскрыць.

— Хачу асобна згадаць пра так званыя нагружаныя вузлы. Як правіла, вытворца прадугледзеў для кожнага з такіх кампанентаў сваю маслёнку. І ўсё б нічога, але яе трэба перыядычна папаўняць. І вось калі-нікалі здараецца так, што нейкі вузел змазаны недастаткова або ўвогуле працуе «насуха». У такім выпадку ён моцна разаграецца і заклінresponse. Тэмпература ў ім павышаецца да такіх паказчыкаў, што пачынаюць гарэць размешчаныя побач арганічныя матэрыялы — паліцы або гума.

Дзмітрый Мурашка згадвае выпадак, які адбыўся некалькі гадоў таму з прэс-падборшчыкамі. У адной гаспадарцы на полі пры правядзенні сельскагаспадарчых работ згарэў такі агрэгат.

— Мы разабралі пашкоджаны і цэлы вузлы і заўважылі адну рэч. Адзін вал, праз які нацягваюцца прывадныя рамяні, быў у змазцы, цалкам рабочы. А вось у другім слядоў змазкі не было зусім. Да таго ж на метале ўтварыўся сіні налёт, а месцамі нават акаліна. Гэта значыць, што тэмпература тут сягала да тысячы градусаў. Інакш кажучы, утварыўся моцны лакальны разагрэў, значыць, было павышанае трэнне. А яго справакавалі дзве рэчы — закліньванне агрэгата і адсутнасць змазкі.

Другі выпадак. Мы разабралі пашкоджаныя вузлы. У адну з прасавальных камер трапіў камень. Ён выбіваў іскры, перыядычна закліноўваў вал. Урэшце гэта прывяло да пажару. Зрабіць такую выснову дазволіла тое, што ўзгаранне пачалося ўнутры бункера, а ніякіх іншых прадметаў там не было.

— *Ці могуць дапамагчы штатныя сродкі пажаратушэння?*

— Залежыць ад таго, дзе ўзнік пажар. Калі яго ачаг знаходзіцца бліжэй да паверхні, імавернасць таго, што тэхніку ўдасца ўратаваць, узрастае. Але калі загарэўся нейкі глыбокі вузел, то шанцы на гэта рэзка падаюць.

Я рабіў аднойчы экспертызу па ўзгаранні кормаўборачнага камбайна. Інцыдэнт адбыўся на полі падчас уборкі. Пажар быў настолькі хуткі і інтэнсіўны, што камбайн згарэў амаль цалкам. Ад яго засталіся толькі корпус і паўтара кола. А прычынай узгарання стаў аварыйны рэжым работы сістэмы электразабеспячэння.

У гэтым выпадку ўсё пачалося з таго, што замест пластыкавага хамута, прадугледжанага вытворцам, былі ўстаноўлены металічны. Пэўна, рамонтнікі зрабілі гэта дзеля большай надзейнасці — каб ён не перацёрся падчас вібрацыі, якая ўзнікае з-за язды. Металічны хамут і не перацёрся. Але цудоўна сцёша ізаляцыю з дратоў, якія ён мусіць абераагаць. Драты агаляюцца — і электрыка працуе ўжо ў аварыйным рэжыме.



Магутная тэхніка мае пры сабе адпаведныя акумулятары. Іх не паспелі абясточыць, калі пачалося ўзгаранне. А ачаг пажару быў побач з імі. Усе ланцугі знаходзіліся пад напружаннем, і аварыйны рэжым паспрыяў таму, што загарэлася ізаляцыя электраправодкі, якая была размешчана далей.

Мы сутыкаліся з выпадкамі, калі тэхніка гарэла з-за таго, што ў не... уразалі... дадатковую магнітолу.

Эксперт згадвае адзін выпадак, калі пажар, здавалася б, узнік з ніадкуль. Загарэлася фура, якая перавозіла льнотрасту. Але самае цікавае — тое, што агонь ахапіў груз, пакуль машына яго перавозіла. Усё было належным чынам закрыта і апячатана, таму версія старонняга ўмяшання або падпадання цыгарэты адпала адразу. Ды і пасля пагрузкі мінула даволі шмат часу. Перабралі мноства магчымых версій, але ўсё паказвала на тое, што ачаг гарэння знаходзіўся ўнутры льнотрасты. І ўрэшце было прынята рашэнне абследаваць машыну, якая грузіла льнотрасту ў фуру. Вось тады і аказалася, што ў гэтай тэхніцы не быў устаноўлены іскрапагашальнік. Больш за тое, на яе выпускным тракце меліся трэшчыны і розныя няшчыльнасці, праз якія іскры вылятаі вонкі. Адна з іх і прымусіла тлець лён.



## Пад пагрозай — і сабраны ўраджай

Сітуацыю з пажарамі падчас уборачнай комплексна вызначыў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Сяргей ЛАПАНОВІЧ.**

— Камітэту па сельскай гаспадарцы Мінскага аблвыканкама даручана ўвечары сумесна з уласнікамі і прадстаўнікамі зацікаўленых ведамстваў арганізаваць рэйды па месцах захоўвання і перапрацоўкі збожжа і грубых кармоў. Таксама мы звяртаемся да бацькоў з просьбай кантраляваць тое, як дзеці праводзяць свой вольны час, каб яны не гулялі там, дзе складуюцца сена ды салома. Не раз свавольства малых з агнём станавілася прычынай пажараў, ад чаго ў попел ператвараўся ўраджай, які вырасцілі, збіралі днямі і тыднямі. А гаспадаркі атрымлівалі сур'ёзны ўрон. Ды і самі дарослыя часам становяцца вінаўнікамі такіх пажараў, выкінуўшы з акна аўтамабіля недакурак. Хочам звярнуць на гэта ўвагу і персаналу аб'ектаў, якія задзейнічаны ў нарыхтоўцы і захоўванні ўраджаю.

Сёлета на тэрыторыі Мінскай вобласці ўжо адбылося больш за 40 пажараў у месцах захоўвання грубых кармоў. Пры гэтым за ўвесь мінулы год іх было толькі 22. Небяспека такіх узгаранняў у тым, што агонь падчас іх распаўсюджваецца вельмі хутка і вокамгненна знішчае на сваім шляху ўсё.

Напрыклад, 13 жніўня адбыўся пажар на складзе грубых кармоў у вёсцы Вязанка Дзяржынскага раёна. У попел ператварыліся склад грубых кармоў і пяць сціртаў саломы агульнай масай у 300 тон. Такі вялікі ўрон нанесены з-за таго, што не быў належным чынам абсталяваны проціпажарны разрыў паміж сціртамі. Адлегласць паміж імі складала ўсяго пяць метраў пры мінімальна дапушчальнай трыццаць...

— Падчас рэйдаў нашы супрацоўнікі выявілі, што грубыя кармы вельмі блізка складуюцца ад дарог, ліній электраперадачы, будынкаў, лясных масіваў, — адзначае Сяргей Лапановіч. — На некаторых аб'ектах і транспартных сродках не было вогнетушыцеляў. Больш за тое, на некаторыя месцы захоўвання грубых кармоў мог трапіць хто заўгодна.

Ёсць у ратавальнікаў нараканні і наконт месцаў уборкі збожжа. Гаспадары палёў не паклапаціліся пра тое, каб там дзяжурыла пажарная аварыйна-выратавальная тэхніка. Былі нават факты, калі збожжаўборачная тэхніка перасоўвалася без аўтамабіля, прызначанага для тушэння пажару.

— Таксама мы адзначалі тое, што на выхлапных сістэмах не было іскрагасільнікаў. Зафіксавана шмат парушэнняў пажарнай бяспекі падчас работы цеплагенеруючых установак, электрычнага абсталявання. На шчасце аб'ектаў не было пажарнага водазабеспячэння і аўтаматыкі ў спраўным стане. А дзенідзе — нават вогнетушыцеляў...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Фота дадзена ДКСЭ і МНС.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Нафта выйшла на пяцімесячны максімум дзякуючы «Лаўры»



Ураган «Лаўра» ў Мексіканскім заліве стаў галоўнай прычынай павышэння цэн на нафту. Ф'ючарсы ў Нью-Ёрку выраслі ў аўторак на 1,7 працэнта. «Лаўра» абрынулася на паўднёвае ўзбярэжжа ЗША — штаты Луізіяна і Тэхас, дзе знаходзяцца галоўныя амерыканскія нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы. З-за ўрагану цяпер недаступна для рынкаў больш за 84 працэнты «чорнага золата» з Мексіканскага заліва. Ураган «Лаўра» можа прывесці да закрыцця не менш чым 10-12 % магутнасцяў амерыканскіх НПЗ больш чым на шэсць месяцаў, папярэджваюць спецыялісты па мадэляванні паводзін ураганаў з Enki Research. Аднак стыхійнае бедства, хутчэй за ўсё, акажа кароткатэрміновае ўздзеянне на цану нафты. Узровень спажывання пакуль застаецца нявызначаным з-за невыразных паводзін пандэміі COVID-19.

## У Берліне забаранілі правядзенне мітынгаў

Улады нямецкай сталіцы забаранілі запланаваныя на гэтыя выхадныя дэманстрацыі пратэстаў супраць абмежавальных мер, уведзеных для стрымлівання распаўсюджвання пандэміі каранавіруса, перадае Reuters. Такія меры былі прынятыя пасля таго, як арганізатары мітынгу ў пачатку гэтага месяца не змаглі зрабіць так, каб удзельнікі маршу былі ў масках і прытрымліваліся сацыяльнага дыстанцыравання. Каля 20 тысяч чалавек, у тым ліку лібертарыянцы, канстытуцыйныя лаялісты, прыхільнікі крайне правых і актывісты супраць вакцынацыі, прайшлі маршам па вуліцах Берліна 1 жніўня. Андрэас Гейзель, сенатар па ўнутраных справах Берліна, адзначыў, што ўладам неабходна знайсці баланс паміж правам на свабоду сходаў і неабходнасцю засцерагчы людзей ад распаўсюджвання інфекцыі. «Мы ўсё яшчэ знаходзімся ў разгары пандэміі», — сказаў ён. Гейзель заўважыў, што не хоча, каб Берлін стаў арэнай для прыхільнікаў тэорый змовы і правых экстрэмістаў. Паводле яго слоў, калі natoўпы ўсё ж вырашаць сабрацца, нягледзячы на забарону, паліцыі давядзецца ўмяшацца.






## ЯК Я БЫЎ ІНКАСАТАРАМ

«Век дваццаты, век харошы — толькі б грошы, толькі б грошы!..» Гаварылі так зусім нядаўна — у мінулым стагоддзі, але ж і ў гэтым фраза не страціла сваёй актуальнасці. Больш за тое, не страціць, відаць, і ў наступных. Каму-нізму ж у нас не чакаецца...

Карацей, вы зразумелі: размова пойдзе пра грошы.

У той час яны былі папяровыя — «вавёркі», «зайцы», «зубры»... Асаблівай каштоўнасці яны не мелі, таму даходы часам ледзь змяшчаліся ў гаманцах, ну а ў крамах за іншы тавар грошы аддаваліся пачкамі. Ні пластыкавых картак, ні безнаяўных разлікаў ды плацяжоў таксама тады не было, заробкі плаціліся наяўнымі, якія на прадпрыемствы ды ва ўстановы прывозілі касіры.

У нас гэты ганаровы абавязак быў ускладзены на сакратарку. У пэўныя дні Тоня выцягвала з шафы вялікую сумку (потым яна стала цеснай і для грошай пашылі спецыяльны мяшок) і ехала ў касу. Не адна — гэта строга забаранялася, — а з «ахоvай». І на машыне, балазе што з імі ўжо праблем не было. Хто-ніхто ў нашай установе прыязджаў на работу на ўласных аўто, а значыць, дырэктарцы толькі і заставалася, што вызваліць чалавека ад працоўных абавязкаў — даручыць, можна сказаць, святое: прывезці людзям грошы.

У той дзень мы разлічвалі атрымаць зарплату. Але ж вось неспадзяванка: на пляцоўцы — ніводнай машыны, толькі мой матацыкл стаіць, які я толькі што купіў ды пачаў абкатваць, прычым з горам папалам...

Але ж дырэктар гэтага не ведала і таму проста сказала, каб па грошы Тоня ехала са мной.

Ганаровае даручэнне, і яго я спачатку з форсам прыняў, а потым моцна занепакоіўся. Рэч у тым, што мой «Восход» аказаўся надта ж капрызным: з першых дзён ён заводзіўся не тады, калі трэба было мне, а тады, калі стрэльне самому. (Пазней нехта параіў мне паглядзець у тэхпашпарт на дату выпуску. Там значыўся апошні дзень квартала... У вытворцаў, трэба разумець, план «гарэў»...)

Але ж Тоня з пустым мяшком ужо выбегла на вуліцу. Я з жахам падумаў, што будзе, калі матор не завядзецца, і з усёй сілы націснуў на завадны рычаг. Мой «Восход» тут жа адгукнуўся: завёўся! З паўабарота! Тоня ліха гопнула на задняе сядзенне, мы сарваліся з месца.

Гарадская каса была недалёка, хвілін за пяць даляцелі і сталі: матор на ўсякі выпадак я вырашыў не глушыць, аднак Тоня, схадзіўшы «ў разведку», з ганка крычала:

— Глушы свой драндулет! Тут чарга... Можа, з гадзіну буду стаяць!

Ну што тут будзеш рабіць: я паслухаўся — стаў чакаць...

Антаніна са сваім аб'ёмным мяшком з'явілася хвілін праз сорак.

Я зноў дрыжачай ад страху нагой націснуў на рычаг... І раз, і другі, і трэці... «Восход» — хоць бы чмыхнуў! А вось пасажырка — дык яшчэ і як: вось-вось, гляджу, закіпіць, бо стаіць з мехам грошай, а навокал людзі...

Іншага выйсця я не бачыў — стаў заводзіць «Восход» з разгону: метраў з дваццаць яго «працягнуў» (Тоня следам бегла), змогся, а матацыклу майму хоць бы хны!

Тады ўжо і Тоня мех з грашыма закінула за плечы і, адной рукой трымаючы яго, другой стала папіхаць мой «Восход».

Пасля гэтага матор усё ж завёўся, і мы паехалі.

...На месцы Тоня злезла з матацыкла, а на мяне паглядзела так, што я зразумеў: грошай сёння не дасць... Альбо апошняму, хоць у нас за правіла было: той, хто прывозіў касіра, атрымліваў першы.

Так яно, у прынцыпе, і выйшла: заробак Тоня аддала — разам з крылатым: «Каб я хоць калі-небудзь, ну хоць раз яшчэ, села на гэтую таратайку...»

І праўда: болей — не села. У прыватнасці, на маю.

**Мікалай Камароўскі**, *г. Орша.*

## «ПРЫСНІСЯ ТОЙ, ХТО БУДЗЕ СА МНОЙ»

...Амерыку не адкрыю: усе маладыя дзяўчаты (ды і хлопцы...), напэўна ж, хацелі б ведаць: куды завядуць іх жыццёвыя сцежкі-дарожкі, з кім урэшце звяжуцца лёсы і калі тое будзе?

Мне ў мае 17-18 гэтыя пытанні хвалявалі менш, а вось суседку-сяброўку...

Яна ў мяне ну вельмі прыгожай была! Кавалеры ліплі з усіх бакоў: прызнаваліся ў пачуццях, клікалі замуж. І яна, здаецца, пайшла б, але ж вельмі баялася памыліцца, уляпацца ў абы што...

Карацей, мы сабраліся варажыць. Для гэтага — як старэйшыя падказалі — трэба ў купальскую ноч з самай першай зоркай знайсці ў лузе трыпутнік, нахіліўшыся, зубамі сарваць яго, моўчкі, каб ніхто не ўбачыў, занесці пад сваю падушку і са словамі «Прысніся той, хто будзе са мной» легчы спаць.

Карацей, на словах усё было проста, а вось на справе...

Вочы забалелі, пакуль мы ўбачылі тую першую зорку, смех разбіраў, калі навобмацак шукалі траву, аж душыліся ад рогату, зрываючы яе зубамі, а ўжо моўчкі несучы дадому...

Там мне болей пашчасціла: мая матулька (светлай памяці!), напрацаваўшыся, ужо звалілася спаць, а вось сяброўчына, зглядзеўшы, што дачка не ў хаце, сабралася яе шукаць. Толькі ступіла за весніцы — Каця насустрач.

— Дзе ты была? — пытае матуля.

Дзяўчына маўчыць (травіна ў зубах).

— Табе што — мову адняло? Размаўляць са мною не хочаш?

Каці б нейк растлумачыць, што ёй зараз нельга, што яна варожыць... А як гэта зрабіць?

Зазлавалася, што не ўдаецца (а маці не адстае), сплюнула тую травіну і давай агрызацца:

— Ты што — хочаш, каб я дома сядзела, каб з курамі спаць лажылася?

...Такім чынам «эксперымент» сарваўся: Каці не прысніўся ніхто (мне, дарэчы, таксама, хоць я і зрабіла ўсё як трэба).

Але замуж мы ўсё ж такі выйшлі. Сяброўка — налета — за вельмі прыстойнага і прыгожага старшыню калгаса. Я — трохі пазней.

Што цікава, абодвух нашых мужоў завуць Валодзямі.

**Марыя Крывец,**
*Клічаўскі раён.*

## ГУЛІ І ПАНА РАЗУЛІ

...Ажаніўся Сцёпа рана —
У няпоўных дваццаць год.
Гэтак лёсіла Сцяпану
Праз банальны эпізод.
Неблагі ён быў хлапчына,
Праўда, ростам невялік.
З-за таго ён часам кпіны
Чуў ад вострых на язык.
За дзяўчатамі не бегаў,
Вечарынкі — абмінаў,
Хоць сябры яго са смехам
Часта звалі да забаў.
А урэшце... падпалі,
Давялі, што ён жаніх.
Ды пакінулі ў Амілі
На ўсю ночку удваіх.
І не збег Сцяпан ад дзеўкі,
Хоць яна і «баба-гром»:
Грудзі — поўныя вядзерцы,
Стол паломіць кулаком.
І фігураю, і ростам
Для Сцяпана — не раўня.
Ды вясковы люд няпросты:
Стала раіцца радня.
— Хай бяро тады Амілю,
Дзеўку ганьбіць не дадзім!
Ці ж вяселле не асілім?
Дапаможам, як адзін!..
Пажанілі...
Ёсць дачушка,
Хоць і года не прайшло.
Сцёпа сам начамі гушкаў,
Чым здзіўляў сваё сяло.
Год-другі — ізноў дзяўчынка.
А за ёй — яшчэ адна.
— Што ж ты, брат, без перапынку?
Павучыся б хоць, аднак...
Ды на гэтую параду
Сцёпа ўвагі не звяртаў:
Працаваў ён да упаду —
Еў не еў і спаў не спаў...
Што Аміля? Памажнела,
За Сцяпанам жывучы,
Дома з дзеткамі сядзела,
А каб нешта памагчы...
Сцёпа вернецца з работы —
Дома — новай не злічыць!
Пустазелле роўна з плотам,
«Свінства» з голаду пішчыць,
Дзень нямытая пасуда
Прастаяла на стале,
Зарасла падлога брудам —
У людзей чысцейшы хлеў...
Сцёпа правіць гаспадарку,
Бо Аміля позна спіць,
Ён за прачку і кухарку,
Каб жа толькі дагадзіць!
Не заўважыў, як стаптаўся:
Побач з жонкай — што смарчок.
Але ж як ні упіраўся,
Ад яе — адзін папрок:
— А чаго ж тады жаніўся,
Калі гэтакі слабак?
Напладзіў дзяцей — круціся,
Ты ж не зломак як-ніяк...
...Але ж восенню на свята,
Яшчэ поўдзень не настаў,
Нечаканы госць у хату
Да Сцяпана завітаў.
Як святыя там дачушкі,
Спяць адна каля адной,
І Аміля у падушках
Узвышаецца гарой.
А нямытыя талеркі
На стале і пад сталом,
Там — анучы, там — паперкі.
Там не хата, а дурдом!
Госць цішком, бачком і ў сенцы,
За парог і лататы...
Па дарозе ён суседцы
Расказаў пра тых «святых».
А яна ўжо і Сцяпану
Далажыла, як было.
І таго (хаця й не п'яны),
Як ніколі, праняло.
У гумне мяшок хапае,
Забягае з ім у дом,
Ўсё, што бачыць, «падграбае»
Са стала і пад сталом:
Закарэлыя патэльні,
Міскі, брудныя гаршкі,
Кубкі, слоікі, відэльцы,
Іншы скарб такі-сякі.
І у дзверы...
І да рэчкі
Напрасткі, праз агарод...
Так без лаянкі і спрэчкі
Сцёпа вычысціў смурод.
Заікнулася Аміля:
— З чаго ж есці будзе нам?
— Раз пасуду не памылі,
Яе месца будзе там!
Ў жонкі злосці — поўны косці,
Але ж слухае... Маўчыць.
Зразумела, мусіць, штосьці?
Эх!.. Раней бы павучыць...

**Віктар Сабалеўскі**, *г. Узда.*

**1915** год — нарадзіўся Павел Кірылавіч Белавусаў, беларускі скульптар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1920** год — нарадзіўся Барыс Васілевіч Бандарэнка, беларускі вучоны, кандыдат тэхнічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1925** год — нарадзіўся Георгій Рамановіч Мартынаў, артыст балета, заслужаны артыст Беларусі.

**1995** год — у Мінск прыбылі ўдзельнікі міжнароднага маршу «За бяз'ядзерны свет», які прайшоў па тэрыторыі васьмі еўрапейскіх дзяржаў і шырагу раёнаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.




**1850** год — з англійскага парахода буксіра «Галіяф» праз праліў Па-дэ-Кале ўпершыню ў свеце быў пракладзены марскі тэлеграфны кабель.

**1895** год — нарадзіўся Мікалай Сяргеевіч Шацкі, расійскі геолаг, адзін з заснавальнікаў вучэння аб геалагічных фармацыях, акадэмік АН СССР. Аўтар прац па параўнальнай тэктоніцы старажытных платформаў. Пад яго кіраўніцтвам упершыню складзеныя тэктанічныя карты СССР і Еўразіі. Лаўрэат Ленінскай і Сталінскай прэмій.



**1925** год — нарадзіўся Юрый Валянцінавіч Трыфанаў, рускі пісьменнік. Аўтар раманаў «Студэнты», «Дом на набярэжнай», аповесцяў «Абмен», «Іншае жыццё»... Лаўрэат сталінскай прэміі.

У гэты ж дзень нарадзіўся Аркадзь Натанавіч Стругацкі, расійскі пісьменнік. Аўтар навукова-фантастычных апавяданняў і аповесцяў «Цяжка быць богам», «Панядзелак пачынаецца ў суботу», «Непрызначаныя сустрэчы», якія стварыў у суаўтарстве з братам Барысам Стругацкім.

**1960** год — у Браціславе (Славакія) прайшоў першы чэмпіянат свету па вышэйшым пілатажы.




**НІНА ЗАГОРСКАЯ:**

*«Другу баліць — мне нялёгка,*
*Маме баліць — вельмі цяжка,*
*Сыну баліць — невыносна,*
*А Радзіме баліць — сэрца стыне ад болю».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Я штосьці не зразумела! Гэта хто табе замест мяне настрой сапсаваў?**

У сталоўцы:

— Скажыце, а салата сённяшняя?

— Я вам больш скажу: яна яшчэ і заўтрашняя!

**На прыпынку адчыняюцца дзверы маршруткі, і патэнцыйны пасажыр пытаецца:**

**— А я даеду да вакзала?**

**Кіроўца:**

**— Даедзеце.**

**Пасажыр з патэнцыйнага ператвараецца ў рэальнага, дзверы за ім зачыняюцца, а кіроўца працягвае:**

**— Даедзеце, але, на жаль, не са мной!**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 317 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2549.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

28 жніўня 2020 г. № 32 (568)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

# ЭКАНОМІЯ І БЕРАЖЛІВАСЦЬ

## Ад газу да паліўнай шчэпкі



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

З гэтага ўчастка шырокі паток паліўных шчэпак накіроўваецца на спальванне.

**МІНСКАЯ вобласць з'яўляецца лідарам у краіне па выкарыстанні ўзнаўляльных крыніц энергіі ў кацельна-пячным ацяпленні. Прыкладна чвэрць выпрацаванага цяпла атрымана з дапамогай мясцовых відаў паліва. У цэнтральным рэгіёне ўсё больш з'яўляецца кацельняў, якія працуюць на гэтых рэсурсах, што дазваляе эканоміць валюту і зберагаць экалогію.**

— Высокая ўдзельная вага спажывання мясцовых відаў паліва ў Бярэзінскім, Вілейскім, Капыльскім, Крупскім, Лагойскім, Любанскім, Старадарожскім і Чэрвеньскім раёнах, — уводзіць у курс справы **начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі, энергетыкі і паліва Мінаблвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ.** — У 2019 годзе ў Мінскай вобласці ўведзена ў дзеянне шэсць энергакрыніц на мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсах сумарнай магутнасцю 28,7 МВт. Гэта — у вёсках Лугавая Слабада Мінскага, Каралёва Уздзенскага, Морач Клецкага раёна, аграгарадку Блонь Пухавіцкага раёна і ў горадзе Чэрвень.

Кацельня ў Чэрвені, якую мы наведалі з фотакарэспандэнтам, сапраўды ўражвае. Гэты сучасны аб'ект аснашчаны, так бы мовіць, па апошнім слове тэхнікі. Зладжаная бесперапынная работа абсталявання ў многім залежыць ад аператара кацельні, які кантралюе ўсе працэсы, выведзеныя на экраны камп'ютараў.

стар. 4

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗВАРОТАЎ «НЕ ПА КАМПЕТЭНЦЫІ» Ў САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ НЕ БЫВАЕ

**Вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, якія яны адрасавалі сенатарам за сёлетняе паўгоддзе, разгледзелі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, было адзначана, што работа ў гэтым кірунку пабудавана на сістэмнай аснове ў адпаведнасці з патрабаваннямі, замацаванымі заканадаўчымі актамі, якія рэгулююць гэтую сферу грамадскіх адносін, а таксама ў рамках пастаўленай кіраўніком дзяржавы задачы па яе актывізацыі. Усяго ў першым паўгоддзі бягучага года сенатарамі было разгледжана больш за дзве тысячы зваротаў. Найбольшая колькасць іх, пісьмовых, паступіла ад мінчан (550), найменшая — ад жыхароў Гродзенскай вобласці (53).

У Савет Рэспублікі звяртаюцца заяўнікі як з канкрэтнымі прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства, так і з просьбамі аб растлумачэнні нарматыўных прававых актаў аб дапамозе ў вырашэнні розных сацыяльна значных пытанняў, тэматыка і структура якіх не перажывае істотных змен на працягу апошніх гадоў. У першую чаргу гэта датычыцца жыллёвага фонду і дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гаворка ідзе аб пастаноўцы дамоў на капітальны рамонт і якасці яго правядзення, рамонту кватэр, пад'ездаў, добраўпарадкавання двароў, нармалізацыі работы сістэм водазабеспячэння, вентыляцыі і гэтак далей.

Другая значная па колькасці катэгорыя зваротаў — тыя, якія датычацца дзейнасці органаў унутраных спраў, следства, пракуратуры, юстыцыі і судоў, у якіх заяўнікі выказваюць нязгоду з судовымі пастановамі па крымінальных, грамадзянскіх і адміністрацыйных справах. Пры гэтым у 98 % выпадкаў, як было адзначана на Прэзідыуме, пасля атрымання з Савета Рэспублікі разгорнутых адказаў паўторныя звароты заяўнікамі не накіроўваліся.

стар. 2

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### У фармаце 3D



У Савеце Рэспублікі працягваецца актыўная дзейнасць па стварэнні музея. стар. 2

### Ажно трэскі ляцяць!



Мясцовае паліва выгаднае, але патрэбна аўтаматыка. стар. 13

### Сонечныя кілаваты



Мсціслаў робіць стаўку на альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. стар. 13

### Парк стары — змест новы



Як у аграгарадку Князева Зэльвенскага раёна аднаўляюць зону адпачынку каля маляўнічага вадаёма. стар. 15

### Са смакам сыру...



Незвычайнае свята «Вясковы сыравар» прайшло ў аграгарадку Жупраны, што на Ашмяншчыне. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# На карысць народаў

## Беларусь нацэлена на пошук новых магчымасцяў для актывізацыі супрацоўніцтва з Уругваем

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА павіншавала віцэ-прэзідэнта Усходняй Рэспублікі Уругвай, старшыню Сената Генеральнай Асамблеі Усходняй Рэспублікі Уругвай Беатрыс Аргімон і яе калег са 195-годдзем незалежнасці Усходняй Рэспублікі Уругвай.**

У віншаванні выказваецца ўпэўненасць, што актывізацыя канструктыўнага дыялогу заканадаўчых органаў Беларусі і Уругвая будзе спрыяць развіццю і ўмацаванню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных сферах дзейнасці на карысць народаў нашых краін.

# Хутка — у фармаце 3D

## У Савеце Рэспублікі працягваецца актыўная дзейнасць па стварэнні музея

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў нараду па пытаннях стварэння музейнай экспазіцыі.**



Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з этапамі падрыхтоўкі прэзентацыйнага фільма, відэазамалёўкі, відэароліка аб Савеце Рэспублікі і 3D-тура віртуальнай рэальнасці па будынку верхняй палаты беларускага парламента. Яны пагадзіліся з прадстаўленым варыянтам афармлення прэс-цэнтра, абмеркавалі ход работ па набыцці тэхнічнага абсталявання і выбары вітрын для размяшчэння музейных прадметаў і іншага.

У нарадзе ўдзельнічалі начальнік Сакратарыята Савета Рэспублікі Аляксандр Слабадчук, начальнік аддзела матэрыяльнага забеспячэння галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Зорыч, дырэктар дызайнерскай студыі Валерый Рысакоў, дырэктар ТАА «Тэхнамузей» Вадзім Дзем'яновіч, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Ніна Калымага, прадстаўнікі ТАА «Філ-ТВ» Віталь Філінскі, Аляксей Краеў і супрацоўнікі Сакратарыята.



# ЗВАРОТАЎ «НЕ ПА КАМПЕТЭНЦЫІ» Ў САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ НЕ БЫВАЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Трэцяе месца па колькасці зваротаў стабільна ўтрымлівае зямельная тэматыка: у асноўным звароты датычыліся пытанняў афармлення неабходных дакументаў на зямельныя ўчасткі, спрэчак паміж суседзямі за лапік зямлі, членамі садаводчых таварыстваў.

— Сярод зваротаў грамадзян, якія паступаюць у Савет Рэспублікі, няма і не будзе накіраваных «не па кампетэнцыі». Кожны зварот, што трапляе ў Савет Рэспублікі, павінен быць разгледжаны належным чынам, — падкрэсліла **спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА.** — Калі людзі не будуць знаходзіць адказы на пытанні, якія іх хвалююць, яны страцяць давер да ўлады.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама агучыла членам



Фота БелТА.

Прэзідыума патрабаванне аб неабходнасці правядзення дасканалага аналізу ўсіх зваротаў грамадзян, што дазволіць выяўляць сістэмныя недахопы, якія сведчаць аб магчымых прабелах у заканадаўстве, альбо аб недапрацоўках на месцах.

На асаблівым кантролі ў Савеце Рэспублікі застанецца арганізацыя асабістых прыёмаў як у рэгіёнах, так і ў Мінску, а таксама правядзенне прамых тэлефонных ліній, у тым ліку тэматычных. Так, у першым паўгоддзі праведзена 10 тэматычных прамых ліній, 40 асабістых прыёмаў грамадзян, падчас якіх звярнулася 413 чалавек.

У прыватнасці, да сенатараў людзі звярталіся па розных пытаннях. У Юрыя Наркевіча, старшыні Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, прасілі ўзнавіць аўтобусны маршрут «Пружаны — Млынок». Гэтае пытанне вырашана станоўча. Да Наталлі Якубіцкай, старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, заяўнік прыйшоў з праблемай рэгістрацыі зямельнага ўчастка ў Жодзіне: ён не мог яе вырашыць на працягу некалькіх гадоў. Гэты зварот сенатар разгледзела з выездам на месца разам са спецыяльна створанай камісіяй. Па выніках разгляду заяўнік накіраваў пісьмовую падзяку члену Савета Рэспублікі.

Трэба сказаць, што на адрас электроннай пошты Савета Рэспублікі паступаюць дзясяткі зваротаў, у якіх утрымліваюцца словы падзякі парламентарыям за дапамогу і выказваецца падтрымка курсу дзяржаўнай палітыкі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ДАСЛОЎНА

# АБАРАНІЦЬ ДЗЯЦЕЙ АД ХАОСУ

**На мітынгу, які прайшоў у Пінску, у падтрымку міру, бяспекі і спакою ў краіне Уладзімір ХРАЛЕНКА, дырэктар ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах сказаў:**

— Я кіраўнік аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў не толькі Пінскага раёна, але і Беларусі, працую тут 25 гадоў. Я прайшоў той шлях, калі яно было практычна разбурана, і прайшоў яго з гонарам са сваім калектывам пры дапамозе дзяржавы. Цяпер — гэта найбуйнейшае прадпрыемства, дзе працуюць 750 чалавек. Наш аграгарадок Парахонскі — самы прыгожы і самы любімы. Тут жывуць 2,5 тысячы чалавек, з іх 500 дзяцей. Гэта аб чымсьці сведчыць?! Дзеці — гэта будучае краіны! І мы прыйшлі сюды абараніць сваіх дзяцей ад гэтага хаосу, які пачаў распаўсюджвацца па нашай краіне. Беларусы зрабілі свой выбар, правільны выбар, я яго падтрымліваю, і падтрымлівае маё прадпрыемства, таму што гэта дае нам спакой, магчымасць рабіць добрую справу — расціць хлеб і гадаваць дзяцей.

# УСЕ ПРАЕКТЫ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫЯ

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ сустрэўся з кіраўнікамі адміністрацыйна-гаспадарчых службаў сваёй установы.**

Парламентарый падзякаваў работнікам дапаможных службаў бальніцы за згуртаванасць і прадукцыйную дзейнасць нягледзячы на складанасці, з якімі ім даводзіцца сутыкацца на працягу ўсяго года: ад пандэміі да сітуацыі, якая склалася ў краіне па выніках выбарчай кампаніі.

На сустрэчы абмяркоўваліся далейшыя планы па рэканструкцыі ўстановы, завяршэнні работ па мадэрнізацыі кансультацыйнай паліклінікі з увядзеннем электроннай чаргі і тэлемедыцынскага кансультавання.

Кіраўнікі падраздзяленняў запэўнілі парламентарыя, што цяперашняя сітуацыя не адаб'ецца на дзейнасці адміністрацыйна-гаспадарчых падраздзяленняў, дзе ўсе гатовыя і далей добрасумленна працаваць і завяршыць усе праекты, запланаваныя на бягучы год.



СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

**Сяргей СІВЕЦ:**

# «Неабходна крытычна ацэньваць заклікі, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве сустрэўся з працоўным калектывам Мінскага заапарка.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, сенатар праінфармаваў прысутных аб кампетэнцыі Савета Рэспублікі, ключавых палажэннях праектаў Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія рыхтуюцца Палатай прадстаўнікоў да разгляду ў другім чытанні, а таксама аб распачатай па даручэнні кіраўніка дзяржавы рабоце па падрыхтоўцы новых кодэксаў аб крымінальнай адказнасці.

Сяргей Сівец звярнуў увагу работнікаў установы на фундаментальныя дасягненні нашай краіны за 30-гадовую гісторыю яе суверэнітэту і незалежнасці, спыніўся на выніках нядаўняй кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, закрануў пытанні адказнасці за парушэнне заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў і параіў усім крытычна ацэньваць заклікі асобных грамадзян, у тым ліку якія знаходзяцца па мяжой, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне, і якія пасягаюць на яе суверэнітэт і нацыянальную бяспеку.

Старшыня Пастаяннай камісіі падрабязна і аргументавана адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

# КАЛЕКТЫЎ АДНАДУМЦАЎ

## Наталля ЯКУБІЦКАЯ сустрэлася з работнікамі барысаўскага завода

**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Якубіцкая наведала з рабочым візітам ААТ «БАТЭ» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты», паведамляе раённая газета «Адзінства». Разам з ёй на валаўтваральным прадпрыемстве пабывалі і старшыня Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пётр Навіцкі.**

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні эканамічнага становішча прадпрыемства, аб'ёмаў вытворчасці, перспектыў развіцця. Асобная ўвага была ўдзелена рынкам збыту, у тым ліку замежным, умацаванню пазіцый завода на тых рынках, дзе ён ужо працуе, і пошуку новых. Наталля Якубіцкая падкрэсліла, што барысаўскаму прадпрыемству належыць значная роля ў развіцці не толькі свайго рэгіёна, але і Мінскай вобласці.

Затым Наталля Віктараўна азнаёмілася з работай вытворчасці. Кіраўнікі падраздзяленняў і цэхаў расказалі аб прадукцыі, што тут выпускаецца, яе канкурэнтаздольнасці ў параўнанні з айчыннымі і імпартнымі аналагамі. Госця пабачыла, як працуюць сучасныя вытворчыя лініі, і высока ацаніла ўмовы, створаныя на рабочых месцах, адзначыла, што тут добрае асвятленне, фірменнае спецадзенне і сродкі ахове, дакладна наладжаны працэс. Яна таксама выказала захапленне вялікай калекцыяй пакаёвых раслін у цэхах: «Незвычайна для вытворчасці з «суровым характарам», але пры гэтым душэўна». Наталля Якубіцкая пагутарыла з калектывам, пацікавілася, якія пытанні яго хвалююць і што, на яго думку, патрабуе першачарговага вырашэння. Размовы былі непрацяглыя, але інфарматыўныя для абодвух бакоў і праходзілі ў добразычлівай атмасферы, падкрэслівае выданне.

— Як чалавек, што ўзначальвае дэпутацкі корпус Міншчыны, я заўсёды звяртаюся да выбаршчыкаў з заклікам да адзінства і падтрымкі стабільнасці і міру, узаемаразумення, — падкрэсліла старшыня Мінаблсавета. — Мы не можам сёння дзяліць людзей на нейкія лагеры: усе мы, беларусы, — адзіны народ, у гэтым наша сіла. Мы, дэпутаты рознага ўзроўню, адкрыты для канструктыўнага дыялогу, гатовы падставіць плячо кожнаму, хто ў гэтым мае патрэбу, і вырашаць праблемы, што маем, мірным, цывілізаваным шляхам.

Наталля Якубіцкая падзялілася пачуццямі ад наведвання завода, піша карэспандэнт «Адзінства».

— Я ўражана тым, што ўбачыла на прадпрыемстве, пагутарыла з многімі работнікамі ў цэхах — з людзьмі рознага ўзросту, з мужчынамі і жанчынамі. У завадчан аптымістычны настрой. Яны расказалі, што заработная плата выплачваецца своечасова, умовы працы добрыя. Падзяліліся і злабадзённым: хутка 1 верасня, і тыя работнікі, у каго ёсць дзеці, заняты падрыхтоўкай да школы. Вольны час праводзяць з роднымі, сябрамі: лета — выдатная пара для адпачынку на прыродзе. Хтосьці выязджае на экскурсіі па Беларусі. У нашай краіне ёсць што паглядзець.

— І наогул адчуваецца, што калектыў на заводзе зладжаны, аб'яднаны агульнымі вытворчымі задачамі, якія паспяхова вырашаюцца, — працягвае Наталля Якубіцкая.

Яна падзякавала кіраўніцтву ААТ «БАТЭ» за стварэнне дастойных умоў працы, уменне з'яднаць людзей, падкрэслівае «Адзінства». «Упэўнена, што работнікі здольныя справіцца з любымі цяжкасцямі, бо яны калектыў аднадумцаў», — сказала напрыканцы спікер абласнога парламента.



Я ТАК ДУМАЮ

# «ХТО ПРАЦУЕ, ТОЙ І МАЕ»

**Мікалай ДУДЗІК, старшыня Камунараўскага сельвыканкама Любанскага раёна, дэпутат сельскага Савета:**



— Я хачу бачыць Беларусь мірнай, квітнеючай. Гэта самае галоўнае. А павышэння якасці жыцця можна дасягнуць самаадданай карпатлівай працай на карысць сваёй Радзімы і сям'і. Калі будзеш ленавацца, спадзявацца, што табе нехта нешта прынясе, дасць, то не разжывешся. Ніхто для нас нічога не зробіць, ні пан з Польшчы, ні хто іншы з-за мяжы, калі не будзем працаваць самі на сябе. Бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы, але нават мыш рызыкуе жыццём, каб яго адтуль дастаць.

На тэрыторыі нашага сельсавета пражывае 2860 чалавек. Людзі працуюць у адкрытым акцыянерным таварыстве «Палессе-Агра», гадавальніку Сасноўскага лясніцтва. Акрамя таго, шмат хто з іх займаецца асабістай гаспадаркай — трымае коз, курэй, качак, гусей, кароў. Усяго на тэрыторыі сельсавета налічваецца 250 галоў буйной рагатай жывёлы. Гэта самы вялікі прыватны статак у раёне, ды, бадай, і ў вобласці. Мае землякі здаюць малако дзяржаве. Напрыклад, Святлана Носікава надаіла і прадала больш як 21 тону малака. А гэта нядрэнны прыбытак.

За апошнія 25 гадоў мы пабудавалі нашу ціхую і спакойную краіну. Ці ж нам дрэнна жыць? Працуй, зарабляй грошы, мацуй агульны і асабісты дабрабыт. А набыць у крамах сёння можна ўсё: і адзенне, і прадукты харчавання.

Хто працаваў, мае неабходны стаж, атрымлівае добрую пенсію. Хопіць набыць усё патрэбнае і яшчэ нешта адкласці можна.

Што датычыцца Прэзідэнта, то ён, лічу, не дае нічым не падмацаваных абяцанняў. Глядзіце, колькі ў вёсцы пабудавана жылля для моладзі, спецыялістаў, работнікаў сельгасарганізацый па Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця сяла! Толькі прыходзь, працуй, жыві.

МЕРКАВАННЕ

# «Баліць сэрца за сыноў»

**Тамара УКРУЖСКАЯ, старшыня Семукацкага сельсавета Магілёўскага раёна:**



— Мір і спакой можа прынесці толькі стабільнасць і цвярозае разуменне таго, чым можа скончыцца гэта супрацьстаянне. Нам трэба не разбураць тое, што ўжо ёсць, а прыпыніцца і пачаць ствараць. Толькі тады можна казаць пра будучае. У іншым выпадку яго проста няма. Сёння для любой маці асабліва неспакойна за сваіх дзяцей. У мяне чатыры сыны, мне хочацца, каб яны вучыліся, служылі і працавалі ў мірнай краіне. Двое старэйшых жывуць у Магілёве, у абодвух сем'і, дзеці. Старэйшы займаецца будаўніцтвам, другі заняты ў сферы гандлю. Трэці сын — пагранічнік, вось ужо трэці год пасля ВНУ працуе на гродзенскім напрамку. Ён жанаты, ёсць маленькі сын. Апошнім часам мы вельмі рэдка размаўляем з ім па тэлефоне, ён часта бывае недаступны, і гэта асабліва мяне непакоіць. Самы малодшы сын вучыцца ў БДУ на 4-м курсе юрыдычнага факультэта па ваеннай спецыялізацыі. За кожнага з сыноў у мяне баліць сэрца, бо для маці няма нічога даражэйшага, чым яе дзеці і іх будучае. Мне вельмі хочацца верыць у тое, што хутка ўсё стане на свае месцы і краіна вернецца да мірнага існавання.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

УЛАСНЫЯ ЗАПАСЫ

## Выкарыстанне торфу дазваляе эканоміць дзясяткі мільёнаў долараў

**Дастаткова важнай і важкай часткай нашай нацыянальнай эканомікі апошнім часам з'яўляецца тарфяная галіна, якая адзначыла сваё 100-годдзе ў 2018 годзе. Цяпер яна адыгрывае пасільную ролю ў забеспячэнні энергетычнай бяспекі краіны. Па інфармацыі прэс-службы Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі (ДВА «Белпалівагаз»), штогадовае спажыванне тарфянога паліва ў краіне складае каля мільёна тон, што дазваляе замясціць каля 450 мільёнаў «кубоў» прыроднага газу на суму да 65 мільёнаў долараў.**

Як вядома, на тэрыторыі нашай краіны запасы торфу ацэньваюцца ў 2,4 мільярда тон, з якіх для прамысловай распрацоўкі прыдатныя 302 мільёны тон, або 12 % ад названых запасаў. Адведзена 8,6 тысячы гектараў плошчаў для здабычы торфу з запасамі торфу 27,9 мільёна тон.

Тарфяная галіна ў сістэме ДВА «Белпалівагаз» прадстаўлена 16 арганізацыямі горназдабыўной і апрацоўчай прамысловасці, у тым ліку чатырма філіяламі газазабеспячальных арганізацый, якія ажыццяўляюць здабычу і перапрацоўку торфу, а таксама адной машынабудаўнічай арганізацыяй і праектным інстытутам — дзяржаўным прадпрыемствам «НДІ Белдзіпрапалівагаз».

Як адзначаюць спецыялісты прэс-службы, сёння, дзякуючы праведзенай мадэрнізацыі торфабрыкетных вытворчасцяў, тарфяная галіна мае магутны вытворчы патэнцыял. У нашай краіне штогод здабываецца каля 2,5 мільёна тон торфу, з якога вырабляецца больш за мільён тон прадукцыі паліўнага прызначэння (брыкеты, сушанка тарфяная і торф кускавы) і больш за 100 тысяч тон прадукцыі няпаліўнага прызначэння (грунты тарфяныя, торф верхавы кіпаваны і торф для кампаставання, — гэтая прадукцыя выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы). Каля 100 тысяч тон тарфяной прадукцыі пастаўляецца на экспарт.

У ліку найбуйнейшых вытворцаў паліўных брыкетаў — адкрытае акцыянернае таварыства «ТБЗ Усяж», ААТ «Торфабрыкетны завод Лідскі», ААТ «ТБЗ Ляхавіцкі». У канцы жніўня заканчваецца сезон здабычы торфу. Па стане на пачатак трэцяй дэкады жніўня арганізацыямі тарфяной прамысловасці ДВА «Белпалівагаз» здабыта 1578,5 тысячы тон торфу, што складае 94,5 % да гадавога задання. Выраблена 382,5 тысячы тон брыкетаў і тарфяной сушанкі (95,7 % да задання на названы перыяд).

Арганізацыямі галіны працягваецца работа па пошуку новых рынкаў збыту, пашырэнні пераліку вырабленай на аснове торфу прадукцыі, далейшай мадэрнізацыі і тэхпераўзбраенні вытворчасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

❍ У тэму

## ПАЛІВА І Ў БАЛОЦЕ

**Віцебшчына ў авангардзе выкарыстання мясцовых відаў паліва.**

Па апошніх даных, у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі Прыдзвінскага краю яны ўжо займаюць больш за 71 %.

Летась выпрацоўка адной гігакалорыі з выкарыстаннем у якасці паліва торфу і шчэпак абыходзілася танней, чым на прыродным газе, адпаведна на 16 % і 11 %.

Асаблівасць поўначы краіны ў тым, што гэта — край балот, і, зразумела, запасаў торфу багата, толькі паспявай нарыхтоўваць і перапрацоўваць.

У чым сакрэты Віцебскай вобласці ў эфектыўным і рацыянальным выкарыстанні мясцовага паліва? Бадай, у правільнасці выбранай стратэгіі нарыхтоўкі, апрацоўкі, выкарыстання драўніны і іншага.

У прыватнасці, даўно купляюць катлы з механізаванай загрузкай. Хай яны параўнальна даражэйшыя, але выдаткі можна хутка акупіць.

Дарэчы, у Бешанковічах паспяхова дзейнічае фірма, якая не толькі выраблае, але і распрацоўвае кацельныя ўстаноўкі рознай магутнасці і для розных мэт. У якасці паліва падыходзяць і «біялагічныя адходы» птушкафабрык...

Прадпрыемства паспяхова экспартуе прадукцыю, а рэалізацыя яе на ўнутраным рынку дазваляе заказчыкам эканоміць валюту пры пакупцы больш дарагіх замежных катлоў.

Увядзенне ў эксплуатацыю Беларускай АЭС не перашкаджае рэалізацыі планаў будаўніцтва і падключэння ў рэгіёне сонечных установак, а таксама ветраных. Ды і пра моц вады тут не забываюць. Запуск некалькі гадоў таму віцебскай гідраэлектрастанцыі дазволіў забяспечыць электраэнергіяй усе наваколлі абласнога цэнтра.

Прыдзвінскі вопыт выкарыстання мясцовых відаў паліва вывучаюць у іншых абласцях і нават у расійскім прыгранiччы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЭКАНОМІЯ І БЕРАЖЛІВАСЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— Абсталяванне манціравалі спецыялісты літоўскай фірмы. Такога практычна няма нідзе ў краіне на аналагічных аб'ектах, — упэўнены **начальнік кацельнай гаспадаркі Уладзімір КЛІМ.**

У адным з залаў заўважаем два катлы.

— Гэта газавыя, кожны па 3 МВт. Выкарыстоўваем іх як рэзервовыя, — тлумачыць Уладзімір Канстанцінавіч.

— У якіх выпадках іх запускаеце?

— Калі на вуліцы стаяць траскучыя маразы — мінус 27 градусаў і ніжэй. Прычым, уключаем паралельна і катлы на шчэпцы. Працуем мы толькі першы год. Зіму перажылі нармальна, магутнасцяў хапае. Шчэпка паступае да нас з лясгасаў у дастатковай колькасці. У нас таксама ёсць свая машына для здрабнення адходаў, драўніны. Як правіла, на складзе захоўваецца сямідзённы запас шчэпкі. На сённяшні дзень яе нават больш.

— А што, калі раптоўна знікне электраэнергія? — цікаўлюся ў свайго суразмоўніка.



З новымі аб'ектамі, якія працуюць на мясцовым паліве, знаёміць начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінаблвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ.



Аператару Таццяне КРАСНАГІР даручаны кантроль за дзейнасцю абсталявання кацельні УП «Чэрвеньская ЖКГ».

— У гэтым выпадку аўтаматычна ўключаецца генератар, — адказвае ён.

— Якое цяпло больш эфектыўнае — ад газу або ад шчэпкі?

— У кожнага віда паліва свая цеплааддача. Але па сабекошце шчэпка абыходзіцца танней, бо газ купляем за валюту за мяжой, а шчэпка свая, айчынная, — гучыць у адказ.

Раней на месцы, дзе цяпер стаіць новая кацельня, была старая газавая. Памяшканне знеслі і на яго месцы пабудавалі новае. Кацельня забяспечвае цяплом і гарачай вадой значную частку горада — 1200 кватэр, бальніцу, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, хутка побач з'явіцца і новы дзіцячы садок.

Сёлета будзе ўведзена ў дзеянне і кацельня на 21 МВт на шчэпцы ў вёсцы Бараўляны Мінскага раёна. Работы тут падыходзяць да заключнай фазы.

— На сённяшні дзень у Бараўлянах працуюць газавая і модульная кацельні. У аграгарадку Лясны таксама дзейнічае газавая. З мэтай адыходу ад спажывання «блакітнага паліва» і эканоміі валюты было прынятае рашэнне аб будаўніцтве кацельні на шчэпцы, — кажа **намеснік галоўнага інжынера па будаўніцтве Яўген МІХАЛЕВІЧ.** — Гэтая кацельня ўзводзіцца з перспектывай забудовы двух населеных пунктаў.

> У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Энергазберажэнне» на 2016—2020 гады ў Мінскай вобласці з 2016 да студзеня 2020-га эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў склала 550,4 тысячы тон умоўнага паліва. Уведзена ў эксплуатацыю 20 энергакрыніц на мясцовых відах паліва агульнай магутнасцю 86,2 МВт.

Сапраўды, аграгарадок Лясны і вёска Бараўляны практычна зліліся і нагадваюць мегаполіс, дзе пражывае каля 60 тысяч чалавек. Прычым з кожным годам насельніцтва прыбывае. Таму новая кацельня тут будзе не лішняй.

— Фінансаванне аб'ектаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, пазабюджэтнага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду Міністэрства энергетыкі Беларусі, уласных сродкаў арганізацый, крэдытных рэсурсаў, — канстатуе Аляксандр Яхнавец. — У прыватнасці, на Міншчыне ў 2017—2019 гадах з'явіліся тры энергакрыніцы на фрэзерным торфе ў арганізацыях жыллёва-камунальнай гаспадаркі з прыцягненнем 50 % суфінансавання з пазабюджэтнага цэнтральнага інавацыйнага фонду Міністэрства энергетыкі. У тым ліку ў 2017-м уведзена ў эксплуатацыю кацельня ў вёсцы Рудаўка Нясвіжскага раёна магутнасцю 4 МВт, у 2018-м — у вёсцы Крывая Бяроза Смалявіцкага раёна магутнасцю 3 МВт, у 2019-м — у пасёлку Зялёны Бор Смалявіцкага раёна на 4,5 МВт. У планах на 2020 год — завяршэнне будаўніцтва яшчэ трох энергакрыніц на фрэзерным торфе — у Слуцку, Крупках і Стоўбцах.

Для прыцягнення фінансавых рэсурсаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця, Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Глабальнага экалагічнага фонду ў Беларусі рэалізуецца інвестыцыйны праект «Расшырэнне ўстойлівага энергакарыстання».

У межах рэалізацыі кампанента «Выкарыстанне ўзнаўляльнай драўлянай масы для цеплазабеспячэння» ў цэнтральным рэгіёне, пачынаючы з 2020 года плануецца будаўніцтва сямі энергакрыніц агульнай магутнасцю 51 МВт на мясцовых відах паліва.

У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Энергазберажэнне» на 2016—2020 гады ў Мінскай вобласці з 2016 да студзеня 2020-га эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў склала 550,4 тысячы тон умоўнага паліва. Уведзена ў эксплуатацыю 20 энергакрыніц на мясцовых відах паліва агульнай магутнасцю 86,2 МВт. Таксама павялічана іх доля ў структуры кацельна-пячной гаспадаркі з 14,5 % у 2015-м да 26,6 5 у студзені — чэрвені 2020-га. Доля ўзнаўляльных крыніц энергіі ў першым паўгоддзі сёлета дасягнула 22,9 %.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

У фокусе

# Свята беларускага пісьменства на экране

**Штогод у першую нядзелю верасня традыцыйна праходзіць Дзень беларускага пісьменства. Сёлета свята адбудзецца 6 верасня ў Быхічах Магілёўскай вобласці. Да гэтай падзеі сацыякультурны канал рыхтуецца загадзя — на працягу наступнага тыдня гледачоў чакае тэматычны паказ кіно, а ў дзень форуму запланаваны трансляцыі цырымоній адкрыцця і закрыцця свята, сюжэты з месца падзей у «Навінах культуры» і спецыяльны «Культурны рэпартаж» пра адрэстаўраваны сакральны артэфакт бялыніцкай зямлі.**

Ужо з 31 жніўня і да самога свята эфір «Беларусь 3» будзе дапамагаць настроіцца на пэўны святочны лад: у міжпраграмных відэароліках прагучаць вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова і іншых паэтаў у выкананні дзеячаў культуры, а ў праекце «Запісні на палях» будуць адгорнуты невядомыя старонкі літаратурнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў Івана Навуменкі, Івана Шамякіна, Алеся Адамовіча і Янкі Сіпакова. Акрамя таго, на наступным тыдні гледачы сустрэнуцца ў «Суразмоўцах» з першым намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аленай Стэльмах.

А 6 верасня цэнтральнай эфірнай падзеяй стане паказ святочнага канцэрта ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства і цырымоніі ўручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў 18.45. Увечары тэлеканал пакажа гала-канцэрт урачыстага закрыцця Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах.

На «Беларусь 3» у гэты дзень таксама ўбачым новы выпуск спецпраекта «Культурны рэпартаж», прысвечаны фрэсцы XVIII стагоддзя «Узыходжанне на Галгофу» бялыніцкага кляштара кармелітаў. Працуючы над сюжэтам, каманда тэлеканала на працягу некалькіх месяцаў здымала розныя этапы рэстаўрацыі артэфакта і стварэння экспазіцыі мясцовага мастацкага музея.

Днём гледачы змогуць пранікнуцца адметнай літаратурнай творчасцю Кандрата Крапівы: будзе паказаны фільм «Кандрат Крапіва: чалавек, які смяяўся...» з цыкла «Запісні на палях», а адразу пасля — спектакль сталічнага Тэатра-студыі кінаакцёра «Хто смяецца апошнім» па аднайменнай сатырычнай п'есе. Чакаюць аўдыторыю таксама паказ народнай камедыі Ігара Дабралюбава «Белыя росы» па сцэнарыі Аляксея Дударава і беларускамоўная версія гістарычнай драмы Юрыя Ялхова «Анастасія Слуцкая».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 121

Як мы паведамлялі, на платформе lidraughts.org праходзіў міжнародны анлайнтурнір пад эгідай FMJD — Кубак нацый па шашках-100. Жаночая зборная Беларусі на папярэднім этапе заняла трэцяе месца сярод 11 камандаў і трапіла ў плэй-оф. Там у 1/4 фіналу ў двух матчах перамагла каманду Латвіі, затым у паўфінале моцную каманду Украіны. У фінале ў драматычнай барацьбе наша каманда саступіла Манголіі 3—5, 4—4 і стала сярэбраным прызёрам.

На дыяграме № 84 пазіцыя з партыі паміж М. Нядбайлам — В. Нанам, згуляная ў інтэрнэце на платформе «Гамблер». Белыя згулялі 1.cd4 у надзеі правесці разгромную камбінацыю пасля св4? 2.de5 ff2 3.cd2 ag5 4.h4h4+. Аднак чорныя іх апярэдзілі і правялі свой удар. Пакажыце камбінацыю. Цікава, што ў белых у пазіцыі на дыяграме была магчымасць нічыйнай камбінацыі. Пакажыце яе.

№ 84



№ 84

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, c3, e3, f4, h4 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, c5, f6, h6, c7, e7 (6)

Наш чытач Уладзімір Панько з горада Камянец Брэсцкай вобласці піша, што яму спадабаліся мініяцюры на стаклетачнай дошцы. Сёння прапануем мініяцюру і малую праблему майстра кампазіцыі з Латвіі Г. Андрэева.

№ 85

**Белыя простыя шашкі:** 50, 41, 42, 43, 34, 23, 20 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 39, 21, 22, 12, 13, 7, 10 (7)

№86

**Белыя простыя шашкі:** 42, 31, 30, 21, 23, 25, 19, 13 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 32, 33, 35, 24, 17, 12, 8, 10, 2 (9)

Яшчэ некалькі кампазіцый, якія прыслаў украінскі майстар Анатоль Баланюк, прапануецца вырашыць самастойна

№ 87

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, f2, c3, e3, g3, f4, a5 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, d4, h4, c5, e5, d6, e7, g7 (9)

№ 88

**Белыя простыя шашкі:** a1, e1, f2, e3, g3, f4, h4, a5, h6 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, h2, c3, d4, c5, e5, d6, e7, f8 (9)

№ 89

**Белыя простыя шашкі:** g3, b4, d4, c5, g5, d6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, a3, g7, b8, f8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Праз вішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: з 28 жніўня да 7 верасня ў Мінску (РЦАП па шахматах і шашках, вул. Маркса, 10, вялікая турнірная зала) пройдуць чэмпіянаты Беларусі па шашках-100 сярод мужчын і жанчын.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 120 ад 14.08.2020.

№ 78 1.c1-b2 a3:c1 2.g5-h6 c1:g5 3.h6:b4 a5:c3 4.e1-d2 c3:g3 5.h2:h6 h8-g7 6.h6:f8 +

№ 79 1.a1-b2 a3:c5 2.f6:d8 b8-c7 [ 2...h4-g3 3.h2:f4 b8-c7 4.d8:b6 a5:c7 5.f4-e5 c7-b6 6.e5-f6 b6-c5 7.f6-g7 c5-d4 8.g7-h8 d4-e3 9.h8-c3 ]

3.d8:b6 a5:c7 4.h2-g3 h4:f2 5.g1:e3 c7-b6 6.e3-d4 b6-a5 7.d4-c5 a5-b4 8.c5:a3+

№ 80 1.c1-d2 c3:g3 2.h2:b4 a3:g5 3.h4:a1+ +

№ 81 1.c3-b4 a3:c5 2.d4:b6 f6:f2 3.h4-g5 h6:f4 4.b6-c7 d8:b6 5.a7:g1+

№ 82 1.c5-b6 a7:c5 2.d4:b6 f2:d4 3.b6-c7 b8:d6 4.h2-g3 h4:f2 5.g1:e7 f8:d6 6.h6:c1+

№ 83 1.d6-c7 b8:d6 2.c5:e7 a3:e3 3.g3-f4 f8:d6 4.g5-h6 e3:g5 5.h6:h6

Першыімі дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Брэсцкая вобласць, Баранавіцкі раён, вёска Новая Мыш), А. Галаваній, П. і В. Шульгі (усе Мінск). С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна). В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

Пішыце на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# КОД ДА ЦІКАВЫХ ПЫТАННЯЎ

**Лета амаль скончылася, але гэта не прычына адмаўляцца бавіць час за праглядам цікавых і карысных праектаў, фільмаў. На наступным тыдні ў эфіры беларускіх тэлеканалаў нас чакаюць гульнявое і дакументальнае кіно, праця ужо вядомых і любімых гледачамі праектаў. Так, на другой кнопцы зноў можна далучыцца да «ПІН_КОД»-а, а на «Беларусь 3» пагляздзець цікавыя кінастужкі, якія дакладна дадуць глебу для роздуму.**



## З АДПАЧЫНКУ — У ЭФІР

Маладзёжны інтэрактыўны праект «ПІН_КОД», які выходзіць на тэлеканале «Беларусь 2», зноў распачаў традыцыйныя сустрэчы з гледачамі, вярнуўшыся з летніх канікул. У апошні тыдзень лета каманда шоу актыўна дзеліцца інфармацыяй, як настроіцца на будучы навучальны год, эфектыўна планаваць час і адаптавацца ў калектыве пасля летняга адпачынку.

Аўдыторыю чакаюць не толькі пастаянныя рубрыкі «Этыкет», «Сакрэты ТікТок», «Мабільныя праграмы», «Лайфхакі», «Небяспека ў сецівe», але і новыя анлайн-актыўнасці: відэавыклікі ў прамым эфіры, больш галаваломак і загадак. Таксама гледачы змогуць параней шаму браць непасрэдны ўдзел у стварэнні праграмы — задаваць хвалюючыя пытанні, дзяліцца сваімі праблемамі і расказваць краіне пра ўласныя дасягненні.

Акрамя гэтага, стваральнікі праекта ў новым сезоне працягнуць марафон «Запрасі «ПІН_КОД» у госці!», у рамках якога хлопцы і дзяўчаты маюць магчымасць паклікаць здымачную групу ў свой населены пункт і разам з сябрамі стаць удзельнікамі тэлевізійнага квэсту «Мая малая Радзіма». А «пінкодаўцы», у сваю чаргу, пазнаёмяцца з мясцовымі славутасцямі і таленавітай моладдзю рэгіёна. Нагадаем, што праект «ПІН_КОД» будзе выходзіць на тэлеканале «Беларусь 2» кожны тыдзень з аўторка да пятніцы ў 15.45.

## КЛАСІКА І КЛАСІКІ НА ЭКРАНЕ

Тэлеканал «Беларусь 3» у апошні дзень лета прапануе да прагляду гістарычную драму «Талаш». Фільм, зняты па матывах аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» рэжысёрам Сяргеем Шульгой, пераносіць гледачоў у канец 1919 года. У гэты час Беларусь перажывала складаныя часы, бо актыўна змянялася ўлада, а грамадзянская вайна ўшчыльную падбіралася да міралюбнай краіны. Польскія войскі прыйшлі на Палессе, каб здзейсніць спробу захапіць частку беларускіх тэрыторый. Грамадская думка адносна будучыні краіны падзялілася: адна частка падтрымлівала бальшавікоў, а другая — палякаў. Былі і тыя, хто выбіраў пазіцыю «супраць усіх», выступаў за незалежнасць ад іншых дзяржаў. У вадавароце ваенных падзей апынулася кожная сям'я. Васіль Талаш бярэ ў рукі зброю не па палітычных перакананнях, а з мэтай абараніць сына...

...ся з сынамі Коласа. Галоўную ролю ў кінафільме сыграў Генадзь Гарбук (вядомы па карцінах «Брэсцкая крэпасць», «Белыя росы» і іншых) — па сутнасці, пад яго і пісаўся сцэнарый. Таксама ў складзе артыстаў можна ўбачыць Генадзя Аўсяннікава, Зінаіду Зубкову, Аляксандра Ткачонка, Паўла Харланчука і шэраг іншых выдатных акцёраў. Глядзіце фільм «Талаш» у панядзелак 31 жніўня ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала.

А ў пятніцу 4 верасня на экраны выйдзе дакументальная стужка Уладзіміра Арлова «Ігар Лучанок пра песні, радзіму і сяброў». Творы гэтага кампазітара («Мой родны кут», «Спадчына», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Вераніка» і многія іншыя) даўно здабылі народную любоў. У кожнай мелодыі Ігара Міхайлавіча — свая гісторыя, дзе ёсць пошукі і на...



Паказальна, што ў сваім творчым жыцці рэжысёр кінастужкі неаднаразова судакранаўся з творчасцю беларускага класіка. Так, напрыклад, у свой час Сяргей Шульга (калі яшчэ быў акцёрам) выконваў ролю Сымона-музыкі на сцэне Віцебскага драматычнага тэатра. Там ён, дарэчы, пазнаёміў-

ходкі, натхненне і перажыванні. Стваральнікі фільма прапануюць аўдыторыі знайсці адказы на пытанні: у чым сакрэт поспеху кампазітара і што засталося «за кадрам» яго жыцця. А дапамогуць у гэтых пошуках сябры, калегі і блізкія людзі Ігара Лучанка.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота kino-teatr.ru, belta.by.**

## панядзелак, 31 жніўня



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Мама Лора» (12+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Злы лёс». 1—4-я серыі (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 23.50** «Зона Х». Крымінальныя навіны (12+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**21.55 Серыял «След» (16+).**
**23.30** Арэна.
**0.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
**9.00, 19.40** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.00** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**10.35** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.05** «Да пабачэння» (16+).
**11.50 Камедыя «Прапанова» (12+).**
**13.35** «ЖаннаПажані» (16+).
**14.30** «Калі мы дома-2» (16+).
**14.55 Анімацыйны прыгодніцкі серыял «Стыч!» (6+)**
**15.40 Анімацыйны фільм «Маана» (0+).**
**17.20 Прыгоды «Мсціўцы: вайна з бясконцасцю» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.20 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Печаная капуста.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25, 12.20** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25** «Люблю і памятаю». Мікалай Яроменка.
**10.10 «Аперацыя «Тушонка». Маст. фільм (16+).**
**12.25** «Наперад у мінулае».
**12.50 «Пунсовая кветачка». Маст. фільм (6+).**
**14.00** «Навукаманія» (6+).
**14.25, 21.05** «Вызваленне». Фільм першы «Вогненная дуга» (12+) [СЦ].
**16.00** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Безыменная зорка».
**16.25, 22.55** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**16.40, 22.50 «Талаш». Серыял. 1-я серыя (16+) [СЦ].**
**17.35** Канцэрт «Славянскі базар — 2020».
**19.40** «Апошні дзень». Роберт Раждзественскі (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**6.55** Азбука спорту.
**7.10, 11.55** Хакей. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу.
**9.15** Піт-стоп.
**9.45** Гандбол. Кубак Беларусі. Жанчыны. Фінал.
**11.25** Гульні «на выраст».
**14.10** Плаванне. Кубак і першынство Беларусі.
**16.05** Вось гэта спорт!
**16.20** Міні-футбол. Суперкубак Беларусі.
**18.20** Трэніровачны дзень.
**18.50** Футбол. Кубак Беларусі. Жанчыны. Фінал. «Мінск» — «Дынама-БДУФК». Прамая трансляцыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Кіберспорт. Аўтаспорт. W-серыя.
**22.30** Спорт-цэнтр.
**22.40** На грані фолу. Футбольны агляд.

### АНТ

**6.00 Серыял «Пяты вугал».**
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**7.15** «Беларусь. Сталенне» (16+).
**8.15** «Падзеі».
**9.15** «Контуры».
**10.00, 11.15** «Вялікі модны прыгавор» (6+).
**12.05 Серыял «Два лёсы-3» (16+).**
**13.15 Серыял «Спадчына» (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Прэзумпцыя невінаватасці» (16+).**
**23.00 Серыял «Гурзуф» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.00** Дакументальны праект (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Інквізітар». Серыял (12+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45** «Мінтранс» (16+).
**1.35** «Самая карысная праграма» (16+).

### МІР

**5.00, 10.10 Серыял «Так не бывае» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**18.15, 19.25 Серыял «ППС-2» (16+).**
**22.40, 3.00** Тэлегульня «Гульня ў кіно» (16+).
**23.25, 0.15** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**3.40 Маст. фільм «Сямёра смелых» [СЦ] (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35** «Наша справа» (16+).
**13.00** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Таямніцы следства» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Давай знойдзем адно аднаго» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.25** «Астрапрагноз».
**6.30** Спорт-мікс.
**6.40** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.20** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.15** «Справа лекараў» (16+).
— Раней кацельні на вёсках таксама працавалі на шчэпках, але не былі эфектыўныя, — расказвае кіраўнік раённай камунальнай службы. — Калі перайшлі на аўтаматычны рэжым, адчулі розніцу. Прычым, гэта не даражэй, чым на газе, бо газ мы купляем за валюту, а дровы — за беларускія. І гэта наша надзейная энергетычная крыніца, якая гарантуе бяспеку. Пры тым, мы не адыходзім ад газу, бо катлы могуць працаваць аднолькава і на газе, і на мясцовых відах паліва.

Што дазваляе эканоміць? Аўтаматыка з праграмным комплексам, як вядома, рэч далёка не танная. І ўсё ж гэта выгадна. Суразмоўнік прывёў прыклад работы невялікай кацельні, якая падавала цяпло на абласныя базы і склады медпрэпаратаў. Пасля пераходу на аўтаматыку сабекошт энергіі знізіўся ў тры разы.

### ❍ У ТЭМУ

У 2020 годзе завяршаецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы «Энергазабеспячэнне», адным з асноўных раздзелаў якой стала развіццё мясцовых узнаўляльных крыніц энергіі, што дазволіць узмацніць энергетычную бяспеку краіны. Таму колькасць энергакрыніц на мясцовых відах паліва будзе расці. Да канца 2020 года ў краіне павінна быць уведзена 150 такіх аб'ектаў, з агульнай цеплавой магутнасцю 750 мегават. Гэта дасць эканомію ў 30 мільёнаў долараў у год.

І такіх аб'ектаў некалькі. Калі раней яны былі стратныя, цяпер сталі прыбытковыя і за ацяпляльны сезон цалкам сябе акупляюць. Цяпер большасць малых кацельняў працуе на мясцовых відах паліва. У агульным энергетычным аб'ёме ўласная сыравіна складае каля 60 %. І гэта даволі значная частка.

— Сёлета пачалася рэалізацыя новага праекта — устаноўка кацельнага абсталявання на 24 мегаваты, якая будзе працаваць і на газе, і на шчэпках. Мы скарысталіся пазыкай на пяць мільёнаў долараў ЗША. Хутка выйдзе праект, і праз год аб'ект павінен запрацаваць. Тады доля мясцовых відаў паліва дасягне 75 %, — кажа Андрэй Шкіндзераў.

Праблемай неэфектыўных кацельняў тут заняліся два гады таму. У першую чаргу былі ўзяты пад кантроль аб'екты з невялікай нагрузкай. Падлічылі, што іх абслугоўванне значна перавышае выхад энергіі. Таму выбралі сучасны кірунак — перавод кацельняў на аўтаматычны рэжым.

Па-новаму ўжо працуе пяць кацельняў. Усе даныя выведзены ў дыспетчарскую, а на маніторы бачны ўсе паказчыкі. Праграма пакажа, дзе адбыўся нейкі збой, тады выклікаецца майстар і разбіраецца на месцы, у чым справа.

Шчучынскае ЖКГ у ліку першых у Беларусі, хто вядзе гэтую работу за ўласныя сродкі. Вопыт прыязджаюць пераймаць камунальныя службы краіны. А напрыканцы мінулага года жыллёва-камунальная гаспадарка раёна атрымала дыплом лідара ў намінацыі «Тэхналогіі і праекты на аснове ўзнаўляльных крыніц энергіі» рэспубліканскага конкурсу «Лідар энергаэфектыўнасці Рэспублікі Беларусь — 2019».

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні Дэпартамента па энергаэфектыўнасці, сёлета значную частку сродкаў абласной інвестыцыйнай праграмы плануецца ўкласці ў рэканструкцыю і мадэрнізацыю кацельняў. Два такія аб'екты будуць пабудаваны ў аграгарадку Вярэйкі Ваўкавыскага раёна. Адбудзецца рэканструкцыя цэнтральнай кацельні ў Навагрудку. Тут будуць устаноўлены катлы на мясцовых відах паліва. На ўласную сыравіну пасля рэканструкцыі будуць пераведзены катлы ў Шчучыне, Мастах і Бераставіцы. Каб палепшыць цеплазабеспячэнне Смаргоні, у адной з кацельняў дабавяць яшчэ адну ўстаноўку. А вось у Бярозаўцы Лідскага раёна сёлета будзе здадзена газавая кацельня блочна-модульнага тыпу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

ЭКАЛАГІЧНЫ КІРУНАК

# СОНЕЧНЫЯ КІЛАВАТЫ

## Мсціслаў робіць стаўку на альтэрнатыўныя крыніцы энергіі

**Хутка ў раёне запрацуе адна са значных па сваёй магутнасці геліяэнергетычная ўстаноўка — 1,6 МВт. Спецыялісты кажуць, што гэтай энергіі пры добрым сонечным надвор'і можа хапіць на асвятленне некалькіх невялікіх населеных пунктаў. Праўда, уся выпрацаваная ўстаноўкай электраэнергія будзе накіроўвацца спачатку ў агульную рэспубліканскую сетку, а адтуль размяркоўвацца па спажыўцах. Тым не менш для раёна рэалізацыя гэтага праекта, у якім няма ні капейкі бюджэтных грошай, вельмі важны крок.**

— Гэта па-сапраўднаму значны аб'ект для нашай раённай эканомікі, — кажа **намеснік старшыні Мсціслаўскага райвыканкама Вольга СУДЗІЛОЎСКАЯ**. — Ён дасць дадатковае паступленне падатку на прыбытак у раённы бюджэт. Будзе створана два рабочыя месцы. Да таго ж ва ўсім свеце вядзецца пераход на альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі, і Мсціслаўскі раён уключыўся ў гэтую работу больш актыўна. Мы падпісалі Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі, згодна з якім з'яўляемся ўдзельнікамі міжнароднай праграмы па скарачэнні выкідаў $CO_2$ у атмасферу. Мы развіваем кірунак альтэрнатыўных крыніц энергіі і гэтым пазіцыянуем сябе як экалагічна чысты раён. Геліястанцыі ў нас і раней былі, але не такіх маштабаў.

Новы аб'ект размешчаны на чатырох гектарах зямлі ў вёсцы Асмолавічы Капачоўскага сельсавета. Старшыня сельсавета Аляксандр Пракопаў лічыць, што падобныя праекты толькі на карысць:

— Пакуль там ідзе будаўніцтва, задзейнічаны ў тым ліку і жыхары сельсавета, а занятасць насельніцтва заўсёды станоўчы факт, — кажа ён. — Да таго ж альтэрнатыўная энергетыка — гэта добра, хоць яна наўпрост і не будзе выкарыстоўвацца для патрэб нашых населеных пунктаў, а пойдзе ў агульную энергетычную сістэму.

> «Фотаэлектрычныя станцыі — гэта новыя тэхналогіі, высокая культура атрымання энергіі, — адзначае суразмоўнік.
> — У Беларусі мы будуем ужо трэцюю станцыю. Перад гэтым падобныя з'явіліся ў Нясвіжскім і Сенненскім раёнах. У параўнанні з Еўропай і іншымі краінамі, дзе такіх станцый шмат, мы яшчэ ў пачатку шляху».

Дамоў у Асмолавічах засталося мала, можна па пальцах адной рукі пералічыць, МТФ з канца 80-х не функцыянуе. Сонечная станцыя якраз і будуецца на тэрыторыі гэтай МТФ і прылягаючай да яе няўдобіцы. Лесу няма, затое шмат прасторы — тое, што і трэба, каб з карысцю выкарыстоўваць энергію сонца.

Аляксандр Іванавіч лічыць, што альтэрнатыўная энергетыка заўсёды толькі плюс для экалогіі. У Мсціслаўскім раёне наогул няма шкодных вытворчасцяў.

— У пачатку 2000-х ужо былі ахвотныя ў раёне Асмолавіч ставіць ветраўстаноўкі, але потым чамусьці адмовіліся, — кажа ён. — Зараз іншы заказчык знайшоўся.

Першапачаткова планавалася здача аб'екта ў канцы жніўня, але пакуль работы працягваюцца.

— Узніклі складанасці з пракладкай кабелю — ён праходзіць па не вельмі зручнай тэрыторыі, — кажа **дырэктар СТАА «ТДФ Экатэх» Міхаіл ШЫШАКОЎ**. — Гэтыя работы аказаліся больш складанымі, чым меркавалася. Спадзяёмся, што да канца верасня справімся.

Фірма аказвае інжынірынгавыя паслугі па арганізацыі, праектаванні і будаўніцтве для ЗАТ «РЕАГ Магілёў». Устаноўка належыць менавіта яму.

— Фотаэлектрычныя станцыі — гэта новыя тэхналогіі, высокая культура атрымання энергіі, — адзначае суразмоўнік. — У Беларусі мы будуем ужо трэцюю станцыю. Перад гэтым падобныя з'явіліся ў Нясвіжскім і Сенненскім раёнах. У параўнанні з Еўропай і іншымі краінамі, дзе такіх станцый шмат, мы яшчэ ў пачатку шляху.

Міхаіл Шышакоў адзначае, што знайсці пляцоўку пад геліяэнергетычную станцыю не так лёгка.

— Мы шукаем, дзе ёсць свабодная зямля, непрыдатная для сельскагаспадарчай дзейнасці, якую можна зрабіць больш прыгожай, а калі закончыцца тэрмін дзеяння станцыі, вярнуць у землекарыстанне, — рэзюмуе ён. — Трэба сказаць, што ў Беларусі знайсці такую зямлю складана.

Дарэчы, акрамя сонечнай станцыі, фірма плануе пабудаваць яшчэ і ветраэнергетычную. Яна будзе на невялікай адлегласці ад геліястанцыі. Але работы па яе ўзвядзенні пачнуцца не раней наступнага года.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

# ЯК ІДЗЕ «ПЕРАЗАГРУЗКА»?

**У Наваполацку, дзе каля 98,8 тысячы жыхароў, як і ў Полацкім раёне ў цэлым, актыўна рэалізуецца комплексны план паскоранага развіцця. У гэтым горадзе абласнога падпарадкавання, адным з самых маладых у краіне за прыкладна паўтара года рэалізацыі мерапрыемстваў многае зроблена для больш багатага, камфортнага, адпаведнага патрэбам часу жыцця.**

Наваполацк вядомы як цэнтр беларускай нафтахіміі, адзін з самых развітых у прамысловым і навуковым аспектах у Беларусі. Тут адразу кідаецца ў вочы іншы тэмп жыцця. Наваполацку ўсяго толькі 62 гады, а для горада — гэта ўзрост немаўляці. Вельмі прасторны, у якім даволі цяжка заблудзіцца. Як жартуюць тутэйшыя, галоўнае, запомніць назву самай цэнтральнай вуліцы — Маладзёжная, а астатнія побач...

Тут жыве шмат моладзі і людзей, якім далёка да пенсіі...

Што здзіўляе гасцей — гэта трамвай, які даволі рэдкая з'ява для параўнальна невялікага горада.

Трэба сказаць, што добрыя перамены адбываюцца літаральна кожны месяц, і гэта адчуваецца гараджанамі. Нават скептыкі канстатуюць, што «малодшы брат Полацка» мяняецца ў лепшы бок, патрэбы, пажаданні, мары яго жыхароў улічваюць і стараюцца рэалізаваць. Накont гэтага, дарэчы, **старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ** падкрэслівае, што, каб зразумець, што ў першую чаргу неабходна гараджанам, праводзіліся апытанні і не толькі. Уважліва вывучаюцца прапановы і заўвагі, дапаўненні падчас сустрэч у працоўных калектывах, прамых тэлефонных ліній, асабістых прыёмаў.

Дэпутаты розных узроўняў (ад гарадскога да парламенцкага) тут бралі пад увагу кожны сігнал, факты незадаволенасці, аргументы, якія, на думку нераўнадушных людзей, варта было ўлічыць пры рэалізацыі задуманага ўладай.

У комплексным плане развіцця горада (своеасаблівай «дарожнай карце») налічваецца 16 раздзелаў. І ў іх каля 180 мерапрыемстваў.

Нядаўна ў Віцебскім аблвыканкаме абмяркоўваўся ход рэалізацыі так званай перазагрузкі.

Першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Мацкевіч акцэнтаваў увагу мясцовай улады на энергічны пошук крыніц фінансавання для рэалізацыі планаў. Трэба эфектыўней прыцягваць інвестыцыі, спрыяць стварэнню новых вытворчасцяў і адпаведна рабочых месцаў. Пры гэтым, канешне, не трэба забываць, што акцэнт — на будаўніцтве заводаў, цэхаў, дзе канчатковая прадукцыя будзе не звязаная з перапрацоўкай нафты. Дарэчы, адзін з цікавых аспектаў вопыту — дзейнасць дзяржаўнага прадпрыемства, якое сартуе смецце і перапрацоўвае яго. Робяць там у ліку іншага і плітку для вуліц.

Пры гэтым на ААТ «Нафтан» сёлета плануецца скончыць мадэрнізацыю, вынікам якой стане павелічэнне глыбіні перапрацоўкі нафты. Адпаведна павысіцца якасць выпрацоўваемай прадукцыі.

Большай актыўнасці чакае ад кіраўніцтва гарвыканкама і памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Ліневіч. Ён нагадвае, што рэалізацыя комплексных планаў паскоранага развіцця на асабістым кантролі кіраўніка дзяржавы. Менавіта Прэзідэнт стаў ініцыятарам надання новага дыхання населеным пунктам, дзе жыве 80 тысяч і больш чалавек. Паралельна трэба падцягнуць да гарадскога ўзроўню і глыбінку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




❍ У ТЭМУ

## Сувязь часоў

**Новы мост паміж самым старажытным горадам краіны Полацкам і Наваполацкам — доўгачаканы не адным пакаленнем жыхароў двух гарадоў. Сёлета плануецца яго здача.**

Цікава, што на канструкцыі прадугледжана і веласіпедная дарожка. Такім чынам, можна будзе «закальцаваць» рух на «двух колах» у Полацку і зрабіць больш прываблівым для аматараў не шкодны для прыроды язды ў нафтаград...

Дарэчы, два гарады сталі першымі ў Беларусі, для якіх распрацавалі адзіны план устойлівай гарадской мабільнасці. У выніку Полацк і Наваполацк змогуць стаць «агульнай пляцоўкай» для сумеснага вырашэння рэгіянальных праблем грамадскага транспарту, вялікай нагрузкі дарог з-за вялікай колькасці і актыўнага выкарыстання аўтатранспарту...

## На здароўе!

**Нагодай для гонару людзей з абмежаванымі магчымасцямі стала рэалізацыя дзясяткаў мерапрыемстваў. У горадзе многае створана, каб не было бар'ераў для тых, хто не можа хадзіць, або робіць гэта з цяжкасцю.**

Паспяхова рэалізуецца праект «Наваполацк — ад інклюзіўнай школы да інклюзіўнага горада». Сярод прапаноў — з'яўленне ў вучэбнай установе ліфта.

У Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы стварылі цэнтр алергалогіі. Зроблена яшчэ шмат іншага, каб медыцына была на ўзроўні найлепшых сусветных стандартаў.

Між іншым, усё больш развіваецца кірунак медыцынскага турызму.

Пацвярджэннем таго, што ў пяцігодцы зроблена шмат вельмі карыснага, з'яўляецца занясенне Наваполацка ў 2020 годзе на Рэспубліканскую дошку Гонару. Гэта — высокая адзнака, прызнанне дасягненняў, правільнасці дзеянняў мясцовай улады.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

# Для камфортнага жыцця

### Якія вуліцы Оршы і раёна прыводзяць у парадак?

У райцэнтры і населеных пунктах раёна Аршанская спецаўтабаза праводзіць запланаваныя работы па рамонце дарожнага пакрыцця вуліц, паведамляе «Аршанская газета».




Адрамантавана грунтавое пакрыццё вуліцы Працоўнай, 4-га завулка Івана Мічурына ў Оршы, вуліц Сонечнай і Маладзёжнай у вёсцы Дачная Забалацкага сельсавета. У Высокім праведзены грэйдзіраванне грунтавых дарог і ямачны рамонт на дарогах з асфальтабетонным пакрыццём. У Барані адрамантаваны грунтавыя дарогі з частковым даданнем новага матэрыялу па вуліцах Германа Цітова і Алега Кашавога.

Работы па рамонце вуліц у Андрэеўшчыне запланаваны сёлета на верасень.

Дарожнікі падсыпалі друзам 3-і завулак Усходні і вядуць рамонт грунтавой дарогі па вуліцы Міхаіла Калініна. Таксама ўладкоўваюцца тратуары па вуліцы Паштовай у аграгарадку Бабінічы.

Змяняе выгляд і Прыдняпроўскі парк у раёне льнокамбіната, дзе камунальнікі ўжо адрамантавалі лесвіцу на цэнтральным уваходзе і пракладі першую палову пешаходных дарожак.

ГАРАДСКОЕ АСЯРОДДЗЕ

# У АБДЫМКУ З АЛЕНЕМ

### У Гродне з'явіўся помнік ахоўніку горада — святому Губерту

**Увасобіў вобраз у бронзе вядомы гродзенскі скульптар Уладзімір ПАНЦЯЛЕЕЎ. А ўстаноўлены помнік у самым цэнтры горада, каля плошчы Савецкай.**

Работа над эскізамі пачалася ў сакавіку. Сюжэт прапанаваў сам аўтар: святы Губерт стаіць побач з аленем, абняўшы яго рукой. Напачатку была выраблена фігура з пластыліну, якая «адзела» металічны каркас. Паступова будучы вобраз набыў неабходны аб'ём. Самым галоўным, як лічыць аўтар, было захаваць адпаведныя прапорцыі, каб кампазіцыя не згубілася з-за высокага пастамента.

— Помнік будзе ўстаноўлены на калоне вышынёй 2 метры 20 сантыметраў, — расказаў Уладзімір Панцялееў. — Вызначаны і памер самой пляцоўкі — 50 на 50 сантыметраў. З гэтага вынікалі і параметры самой кампазіцыі, таму давялося заняцца матэматычнымі падлікамі. Урэшце рост фігуры склаў каля метра, з кап'ём — крыху больш.

Святы Губерт — каталіцкі святы, які жыў у VII—VIII стагоддзях у Францыі. Яго звычайна адлюстроўваюць разам з аленем, бо падчас палявання Губерт убачыў аленя з залатым крыжам паміж рогаў. Алень Святога Губерта, які скача праз агароджу, змешчаны на гербе горада Гродна і з'яўляецца яго сімвалам.

Па словах скульптара, выяў Святога Губерта існуе даволі шмат. Тут галоўнае — не паўтарыцца, разам з тым не адысці ад канонаў. Аўтар імкнуўся дабіцца таго, каб гэтая постаць стала новым сімвалам Гродна. Для ажыццяўлення ідэі спатрэбілася некалькі месяцаў. У выніку атрымаўся велічны манумент у бронзе з гранітнай калонай.

— Прапанова новага помніка ўзнікла яшчэ год таму, калі на яго месцы стаяла драўляная скульптура турыста. Вядома, было зразумела, што яна часовая. Таму я выказаў думку: устанавіць на гэтым месцы выяву ахоўніка горада — святога Губерта з аленем. Гарадскія ўлады пагадзіліся, і праект быў зацверджаны экспертным саветам, — зазначыў скульптар.

Дарэчы, улічваліся не толькі параметры самой кампазіцыі, але і тое, як яна будзе глядзецца ў вызначанай прасторы. Такую працэдуру праходзіць кожны арт-аб'ект вобласці. Тыя, што атрымоўваюць узгадненне, знаходзяць свае месца ў гарадскім асяроддзі. Большасць з іх выкананы Уладзімірам Панцялеевым. Сярод яго работ — постаць гараджаніна каля парку Жылібера, статуя «Пакроў» каля сабора, жабка-вандроўніца, памятная дошка гродзенскаму губернатару Пятру Сталыпіну, кампазіцыя на месцы былой Фары Вітаўта.

Меркавалася, што новы манумент стане яшчэ адным падарункам да чарговага XIII фестывалю нацыянальных культур. Нават пляцоўка каля пастамента зроблена ў выглядзе сімвала фестывалю. Але свята вырашылі перанесці на будучы год. Між тым святы Губерт з аленем займе сваё месца каля самай ажыўленай плошчы горада ўжо сёння, 28 жніўня.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



Фота БелТА.

# ПАРК СТАРЫ — ЗМЕСТ НОВЫ

## Як у аграгарадку Князева Зэльвенскага раёна, што на Гродзеншчыне, аднаўляюць зону адпачынку каля маляўнічага вадаёма

**Праект «Адпачынак у Князеве», які ініцыяваў Крамяніцкі сельскі савет, выйграў грант на добраўпарадкаванне старога парку. Месца масавага адпачынку прыводзіцца ў парадак, у першую чаргу — прыбярэжная зона. Будуць закуплены лодкі, катамараны, з'явяцца і гульнявы, і спартыўны комплексы, сцэна для выступленняў. Мяркуецца, што ўвесь каштарыс складзе дзесяць тысяч долараў.**



Грошы не такія і малыя для сельскага савета. Таму праект па добраўпарадкаванні парку прапанавалі на еўрапейскі конкурс. І выйгралі. Праўда, пяць тысяч долараў ЗША. Яшчэ столькі мяркуецца атрымаць ад мясцовай гаспадаркі — філіяла «Князева». З іх боку — закупка матэрыялаў і будаўнічыя работы.

— Гэта мая даўняя мара — аднавіць некалі папулярны ў Князеве парк каля возера, — расказвае **старшыня Крамяніцкага сельскага савета Аляксандр ДЗЕРАЧЭНІК.** — У гады майго дзяцінства там праходзілі масавыя мерапрыемствы, фэсты. Хачу, каб гэта зона зноў ажыла і стала месцам адпачынку, прычым актыўнага, не толькі нашага аграгарадка, але і навакольных вёсак.

Сапраўды, парк знакаміты. Ён закладзены ў другой палове XIX стагоддзя на сядзібе князя Журава і быў невялікі, разам з садам плошча яго складала восем гектараў. І хоць парк не мае нейкай складанай кампазіцыі, тут растуць каштоўныя пароды дрэў, некаторыя захаваліся яшчэ з часоў закладкі парку. Усяго 50 розных відаў. У гэтым месцы можна ўбачыць найлепшыя ў Беларусі ліпы венгерскай і амерыканскай, явара, клёна серабрыстага. Ёсць хвойка чорная, дуб чырвоны, лістоўніца, ясень і іншыя. Прагулкі тут рабілі вакол парка, каля вадаёма. Потым неяк парк прыйшоў у заняпад, і людзі перасталі туды хадзіць.

Сёлета распачалі рэалізацыю праекта. Правялі асноўныя падрыхтоўчыя работы. Да справы далучыліся і мясцовыя жыхары, сапраўдныя патрыёты сваёй малой радзімы. Таксама дапамагае гаспадарка, якая выступіла другім інвестарам праекта. Агульнымі намаганнямі правялі ачыстку тэрыторыі ад смецця. Работнікі філіяла праклалі сцежкі і падсыпалі іх жвірам, добраўпарадкавалі прыбярэжную зону. Таксама сіламі гаспадаркі выдалілі аварыйныя дрэвы. Значным крокам, на думку старшыні сельсавета, стаў дагавор на пастаўку піламатэрыялаў. «Гэта як зрабіць фундамент для дома, які аснова трывалага будынка», — удакладняе Аляксандр Дзерачэнік.

Ён з энтузіязмам узяўся за гэтую справу. Па-першае, сам аб'ект хочацца прывесці ў парадак, а па-другое, гэта тая рэальная справа, па якой у людзей складваецца ўражанне аб рабоце мясцовай улады.

Князева — невялікі аграгарадок, які знаходзіцца ўдалечыні ад трасы. Вёска аднасна маладая, яна стала засяляцца ў 30-я гады мінулага стагоддзя жыхарамі навакольных хутароў. Тут жывуць у асноўным работнікі мясцовага філіяла «Князева». Месца для цікавага адпачынку няма.



Даведаўшыся пра конкурс сацыяльных праектаў «Тандэм», старшыня сельсавета падаў заяўку. Дарэчы, сельскі савет і раней удзельнічаў у конкурсах праектнай дзейнасці, але гэтым разам ініцыятыва атрымала падтрымку ў ліку яшчэ амаль 70 заявак на міні-гранты.

Работы разбілі на некалькі этапаў, і справа зрушылася. Змены тут адчувальныя. Пасля падрыхтоўчага этапу, прыступілі да ўладкавання самой інфраструктуры. Што тут будзе? Па словах суразмоўніка, сярод векавых дрэў з'явіцца сучасная зона адпачынку са спартыўнай, дзіцячай і танцавальнай пляцоўкамі. Будзе добраўпарадкаваны пірс, закуплены лодкі і катамараны. Для дзіцячай пляцоўкі заказалі новы комплекс, амаль зроблена валейбольная пляцоўка. У працэсе работы — сцэна і месца правядзення культурных масавых мерапрыемстваў. Мяркуецца паставіць 15 дэкаратыўных лавак, сметніцы, тры альтанкі са столікамі. «Будзе цікавая паркавая зона», — упэўнены старшыня. Ён мяркуе, што могуць з'явіцца інвестары, якія таксама прымуць удзел у далейшым развіцці паркавай тэрыторыі. Таксама тут спадзяюцца, што парк можа стаць новым пунктам у турыстычным маршруце па зэльвенскай зямлі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**



Парк у Князеве.

### ❍ ДАРЭЧЫ

**У раёне шчыльна заняліся тэмай турызму і нават распрацавалі план комплекснага развіцця Зэльвенскага вадасховішча — аднаго са знакавых аб'ектаў раёна.**

Як растлумачылі ў райвыканкаме, у перспектыве тут павінны з'явіцца стаянкі для маламерных суднаў, будзе пракат лодак і катамаранаў, добраўпарадкаванне і пашырэнне пляжнай зоны. На дамбе мяркуецца ўсталяваць пляцоўку з вулічнымі трэнажорамі. Таксама ў планах прадугледжана адкрыццё кафэ і рэстарана. Вызначаны пляцоўкі для тых інвестараў, хто мяркуе заняцца арганічным рыбаводствам і арганізаваць міні-цэх па перапрацоўцы рыбы. Каля вадаёма будзе пабудаваны гадавальнік па вырошчванні каштоўных парод рыб — судака і сцерлядзі, якія потым будуць запушчаны ў вадаём. Па прапанове мясцовых прадпрымальнікаў, з'явяцца элінгі — спецыяльныя будынкі для плавальных сродкаў і пражывання турыстаў. Таксама будзе распрацаваны веламаршрут вакол вадасховішча і па яго наваколлі.


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту строительства

**«Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 5 по генплану**

**Информация о застройщике:**

Государственное производственное объединение «Минскстрой», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 13а;

режим работы: пн–чт – 8.30 до 17.45, пт – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00–14.00;

тел. 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков строительства:**

- жилой дом № 60 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июль 2017 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 58 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2018 г. – февраль 2019 г.;
- жилой дом № 56 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: ноябрь 2017 г. – март 2019 г.;
- жилой дом № 70 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: июнь 2018 г. – сентябрь 2019 г.;
- жилой дом № 68 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: сентябрь 2018 г. – октябрь 2019 г.;
- жилой дом № 72 по ул. Скрипникова, фактические сроки строительства: январь 2019 г. – декабрь 2019 г.

**Информация об объекте строительства**:

ГПО «Минскстрой» осуществляет строительство объекта **«Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6А в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 5 по генплану.**

**Цель строительства:**

Объекты долевого строительства строятся для личных нужд дольщиков.

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Начало строительства – 22 апреля 2020 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 06 декабря 2020 года.

**Результат государственной экспертизы проектной документации:**

экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2019 № 262-15/19, дополнение от 12.09.2019 № 558-15/19, изменение от 16.10.2019 № 558-15/19-Д1.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**

г. Минск, территория в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки.

**Характеристика объекта строительства:**

Проектом предусмотрено строительство двухсекционного 9-этажного 79-квартирного жилого дома в конструкциях серии М464-У1М, с техническим подпольем, теплым чердаком и плоской рулонной кровлей с организованным внутренним водостоком, встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже здания. Наружные стены надземной части здания запроектированы из железобетонных трехслойных панелей с эффективным утеплителем, внутренние стены – сборные железобетонные. Окна: профиль деревянный, заполнение – стеклопакеты. В квартирах предусмотрена полная планировка, организованы жилые комнаты, кухни, прихожие, санузлы, летние помещения. В квартирах 1 этажа имеются погреба под лоджиями с доступом через люк. Чистовая отделка квартир предусматривает окраску акриловыми красками потолков и стен в санузлах; оклейку обоями в жилых комнатах, коридорах, прихожих, кухнях, кладовых. Полы в жилых комнатах, внутриквартирных коридорах, прихожих, кладовых, кухнях квартир – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове; в санузлах – керамическая плитка.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**

Предлагается 42 объекта долевого строительства для заключения договоров.

Цены на объекты долевого строительства:

ориентировочная стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 238,44 белорусского рубля (для нормируемой площади жилого помещения);

1 993,67 белорусского рубля (для площади жилого помещения, превышающей нормируемую).

**Условия оплаты:**

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 60 % от стоимости объекта долевого строительства, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

В соответствии с решениями Мингорисполкома от 07.03.2019 № 667 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2019 году, по строительству жилых домов для многодетных семей», от 14.11.2019 № 3526 «Об изъятии, предоставлении, прекращении существования земельных участков и разрешении строительства» и от 16.04.2020 № 1179 «О мерах по выполнению задания по вводу в эксплуатацию жилых домов в г. Минске в 2020 году» договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться **с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска**.

**Права застройщика на земельный участок:**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3120 от 24 апреля 2018 года о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000002008741. Земельный участок площадью 6,3137 га.

**Количество в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома:** общее количество квартир – 42 шт., в т. ч. двухкомнатные – 28 шт., трехкомнатные – 14 шт.

**Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, чердак, техподполье и другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, а также элементы озеленения и благоустройства.

**Сведения о договоре строительного подряда, заключенного застройщиком:** договор строительного подряда от 16.04.2020 № 261с-04-20, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства и ходом работ по нему:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Заместитель генерального директора В. А. Косовец*

Открытое акционерное общество
**«Брестторгтехника»**
**(г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32)**
**проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- капитальное строение с инвентарным номером 100/С-9449, площадью 26,3 кв. м (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад ГСМ), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32Б/1;
- капитальное строение с инвентарным номером 100/С-9450, площадью – 123,3 кв. м, (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – подсобные помещения), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32Б.

Объекты расположены *на земельном участке с кадастровым номером 140100000001015433, площадью – 0,1785 га по адресу: г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32.*

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Ответственное лицо: Тимошевич Дмитрий Леонидович, тел. 8 (029)2366626.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 46642,20 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (4664,22 бел. руб.).**

**Задаток перечисляется на р/с BY60BLBB30120200050732001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, БИК BLBBBY2X. Получатель платежа: открытое акционерное общество «Брестторгтехника», УНП 200050732.**

**Шаг аукциона – 5 процентов (2332,11 бел. руб.).**

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже основных средств, принадлежащих открытому акционерному обществу «Брестторгтехника», утвержденным приказом № 73/П от 22.06.2020.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юридическим лицом РБ – копии устава со штампом о проведении государственной регистрации, свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность: представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения аукциона победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) до подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в аукционе оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора аукциона **www.bresttorg.by.**

Аукцион состоится **01.10.2020** в **12.00** по адресу: г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32. Заявления на участие (отказ от участия) и необходимые документы принимаются по **28.09.2020** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: **(0162) 21-55-29, (0162) 21-55-31,** e-mail: **bresttorgtehnika@tut.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки)**
**извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества**
**ОАО «Лунинецкий райагросервис» (продавец)**

**Лот № 250820001: БЛОК СКЛАДОВ И КОМПРЕССОРНАЯ,** инв. № 133/С-14471, 1681,5 кв. м. Адрес: г. Лунинец, ул. Красная, 160В. Обременение: аренда (полный список приведен на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»). Земельный участок с кадастровым номером 124750100001004247, площадь – 0,8685 га. Право аренды по 29.04.2069. Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 350 662,50.

**Лот № 250820002: ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ АБК,** инв. № 133/D-9242, 3086,2 кв. м. Адрес: г. Лунинец, ул. Красная, 160 – 2. Обременение: аренда (полный список приведен на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»). Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 667 764,00. **Электронные торги состоятся 18.09.2020, с 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).** Извещения о проведении электронных торгов размещено на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

**☎ Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

КРЭАТЫЎ

# І ДЛЯ НАСТРОЮ, І ДЛЯ ВЫХАВАННЯ

**Мы ўжо неаднаразова пісалі пра тое, як не сумна жывуць жыхары аграгарадка Семукачы Магілёўскага раёна. Старшыня сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ заўсёды падтрымлівае крэатыўныя ідэі і дапамагае іх рэалізаваць. Гэтым разам яна з гонарам расказала пра дэпутата сельсавета Людмілу ДЗЯТЛІКАВУ, якая мабілізавала моладзь на добрую справу. Нядаўна каля вёскі Вялікія Бялевічы з'явіўся так званы саламяны гарадок з казачнымі героямі. Створаны ён рукамі ўчарашніх выпускнікоў школы, а цяпер студэнтаў, якія прыязджаюць на лета да сваіх бацькоў і бабуль з дзядулямі.**



— Ідэя ўзнікла сама сабой падчас нашых сумесных сустрэч на дзіцячай пляцоўцы, — кажа Людміла Дзятлікава. — Там у нас збіраюцца ўсе актыўныя жыхары — дзеці катаюцца на атракцыёнах, а старэйшыя па ўзросце займаюцца на трэнажорах. Я, напрыклад, прыводжу туды сваіх унукаў. Аднойчы гаворка зайшла пра тую прыгажосць, якая сёння ствараецца з саломы наўсцяж дарог. Вось бы і нам такое, сказала я. Мяне падтрымала настаўніца Семукацкага дзіцячага садка-школы Алена Мудрагелава. Сказана — зроблена.

Дэпутатка патэлефанавала дырэктару мясцовай райаграпрамтэхнікі Станіславу Свістунову з просьбай дапамагчы з «матэрыялам», і той аператыўна даставіў некалькі цюкоў саломы. Народ пачаў фантазіраваць, што з іх зрабіць. Хлопцы пажадалі зманціраваць трактар і машыну, а жанчыны папрасілі стварыць для дзятвы зайчыкаў, пчолак і куранят. Людміла Дзятлікава села за швейную машынку, зрабіла з тканіны і дроту дэталі для саламяных герояў — вочкі, насы, вусікі. Потым яшчэ дзень усё гэта манціравалі.

— Атрымаўся цэлы саламяны гарадок, — радуецца Людміла Леанідаўна. — Цяпер гэта ў нас самае папулярнае месца для фотасесій. Ды і тыя, хто праязджае міма, часта прыпыняюцца і фатаграфуюць нашу прыгажосць. Мы ўжо бачылі тыя фотаздымкі ў сацсетках.

Дарэчы, гэта не адзіная справа, якую тут рэалізуе насельніцтва разам з моладдзю. За апошнія два гады толькі ў Вялікіх Бялевічах з'явіліся дзве пляцоўкі для адпачынку з каруселямі, лаўкамі, горкамі.

— Раней існавалі працоўныя лагеры, школьнікі восенню дапамагалі капаць бульбу, збіралі яблыкі, — кажа Людміла Дзятлікава. — Цяпер яшчэ і гэта практыка ў мінулым. — І мы вырашылі такім чынам выхоўваць у нашай моладзі любоў да працы. Да таго ж гэта з'ядноўвае людзей, натхняе іх на нейкія іншыя агульныя справы. Падобнае дапамагае рабіць нашу малую радзіму больш прыгожай і ўтульнай. І гэта дае надзею, што моладзь, магчыма, захоча вярнуцца сюды і застацца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Семукацкага сельсавета.**

ПАДЗЕЯ

Незвычайнае свята «Вясковы сыравар» прайшло ў аграгарадку Жупраны, што на Ашмяншчыне

# Са смакам сыру...

**Шумна і весела было на пляцоўцы каля мясцовага аддзела культуры і вольнага часу, куды з усіх бакоў падыходзілі сельскія жыхары. Цэнтральнай падзеяй кулінарнага свята стаў кірмаш дамашняй малочнай прадукцыі і рэцэптаў па вырабе сыру. Кожны ахвотны змог не толькі пакаштаваць сыр, масла, але і прыкупіць упадабаны прадукт з рэцэптам, каб потым пачаставаць сваіх родных і расказаць пра спосаб яго вырабу.**



Як паведамілі ў Ашмянскім навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці, розныя віды сыроў прывезлі на кірмаш сыравары. А побач з апетытным гандлёвым радам размясцілася выстаўка сырных страў. Пакуль дарослыя знаёміліся з імі, дзятва атакавала прылаўкі з папкорнам, малочнымі
кактэйлямі, прысмакамі, дзіцячымі цацкамі і велізарную надзіманую горку. Насычаную забаўляльную праграму прапанавалі гледачам работнікі культуры і фізкультурна-спартыўны клуб горада Ашмяны. У спартыўна-гульнявой праграме «Давай наперад за сырам» з задавальненнем удзельнічалі і дзеці, і дарослыя. Незвычайным элементам свята стаў флэшмоб «Жывы сыр», а асаблівай цікавінкай — «Сырнае казіно», адкуль усе ўдзельнікі сыходзілі не з пустымі рукамі, а з сырнымі і малочнымі прызамі. Выдатны настрой на працягу свята дарылі гасцям ансамбль народнай песні «Жытніца» аддзела культуры і вольнага часу аграгарадка Кракоўка, удзельнікі народнага тэатра песні і танца «Імпульс», пад завадныя кампазіцыі якіх актыўныя жупранцы з задавальненнем пускаліся ў скокі. Майстры-сыравары, якія не толькі прадставілі сваю прадукцыю, але і падзяліліся сакрэтамі сыраварства, атрымалі імянныя падзякі і памятныя падарункі. Смачным завяршэннем свята стала агульная дэгустацыя піцы-волата «Вясковы сыравар».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

**(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2020 года.**